Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 173 (30053)

СТУДАТРАДЫ: ПРАЦЯГ НАЙЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЙ ЧЫРВОНКА

МОЛАДЗЬ САМА ПАВІННА ДУМАЦЬ АБ СВАЁЙ БУДУЧЫНІ ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Адзінства — цэментавальная і адначасова рухаючая сіла нашага народа. І менавіта адзінства дапамагала выстаяць, выжыць, перамагчы ворага. Адзінства наш народ праявіў і ў гады польскай акупацыі, і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, і ў пасляваеннае ліхалецце, калі аднавілі народную гаспадарку, і ў 1970—1980 гады, і асабліва ў перыяд станаўлення суверэннай Беларусі. І сёння мы ствараем, нягледзячы на ўсе санкцыі і цяжкасці на знешнепалітычным контуры. Тэму адзінства абвастрылі падзеі 2020 года. І гэтая тэма не была навязаная, яна ініцыіраваная народам».

Салодкі ўраджай

Фота БелТА

У Магілёўскай вобласці Бабруйскі, Бялыніцкі і Кіраўскі раёны прыступілі да ўборкі цукровых буракоў. Ужо накапана 6,3 тысячы тон. На палетках Кіраўскага райаграпрамтэхзабеспячэння ўборка цукровых буракоў набірае абароты. Тут самыя вялікія плошчы пад гэтай культурай — звыш 400 гектараў. «Мы прыкладаем максімум намаганняў, каб сабраць дастойны ўраджай», — падкрэсліў дырэктар прадпрыемства Лявонцій Кушавараў. У гаспадарцы ёсць свой камбайн для ўборкі цукровых буракоў, на якім шчыруе Дзмітрый КОМАР (*на фота*). Спецыялісты адзначаюць, што сёлетняя засуха асаблівага ўплыву на фарміраванне ўраджаю цукровых буракоў не аказала. Цяпер збіраюць па 350-400 цэнтнераў з гектара. Ужо пачалася адгрузка салодкіх караняплодаў на Слуцкі цукраварафінадны камбінат.

КАРАТКА

- **Настаўніка года Беларусі назавуць 28 верасня.**
- Салісты Вялікага тэатра Беларусі адправіліся ў гастрольны тур у Кітай.
- **Новы экамаршрут распрацоўваюць у нацпарку «Нарачанскі».**
- «Класіка для ўсіх». Новы сезон стартуе ў Белдзяржфілармоніі 21 верасня.
- **Дзяржлесахова ў пажаранебяспечным сезоне ліквідавала больш як паўтысячы ўзгаранняў.**

Новыя вяскоўцы

У ЧАКАННІ СВАЙГО МЁДУ,

або Як мы завялі... пчол

Чатыры гады таму, калі мы толькі пераехалі жыць у вёску, зараклі-ся, што, крый божа, не будзем ніколі заводзіць дамашнюю жывёлу. Бо, маючы гаспадарку, праблематычна ад'ехаць кудысьці нават на дзень, не кажучы ўжо пра тыдзень. Але жыўнасць чамусьці так і гарнулася да нас...

СТАР. 13

Пчаляр-пачатковец перастаўляе месцамі рамкі па парадзе свайго сэнсэя Леаніда.

Прэм'ера рубрыкі

Пояс і Шлях. 2013—2023

7 верасня 2013 года Старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас візіту ў Казахстан выступіў з ініцыятывай сумесна сфарміраваць «Эканамічны пояс Шаўковага шляху», які будзе ўключаць пяць канкрэтных кірункаў: умацаванне палітычнай каардынацыі, будаўніцтва адзінай дарожнай сеткі, развіццё гандлёвых адносін, валютных патокаў, сувязяў з грамадскасцю і сяброўскіх кантактаў. Гэта зыходны пункт у развіцці найбуйнейшага сучаснага глабальнага праекта «Адзін пояс, адзін шлях» («Пояс і Шлях»). За дзесяць гадоў унікальная ініцыятыва аб'яднала больш за 150 краін свету. У яе рамках рэалізаваны тысячы знакавых праектаў, якія дазволілі прыкметна палепшыць дабрабыт людзей, звязаўшы кантыненты гандлёвымі маршрутамі і мастамі дружбы. Беларусь адной з першых далучылася да «Аднаго пояса, аднаго шляху». У рамках рэдакцыйнага праекта «Пояс і Шлях. 2013—2023» на старонках «Звязды» і на інтэрнэт-партале zviazda.by з дапамогай экспертаў мы прааналізуем вынікі развіцця і далейшыя перспектывы пашырэння ўнікальнай ініцыятывы, старт якой роўна дзесяць гадоў таму даў Старшыня КНР Сі Цзіньпін.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Міжнародны вектар

СУПРАЦОЎНІЦТВА, ЗАСНАВАНАЕ НА ДАВЕРЫ І САЛІДАРНАСЦІ

У рамках Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму заключана 15 камерцыйных кантрактаў на суму 93,5 мільёна беларускіх рублёў

Дакументы былі падпісаны на пляцоўцы пленарнага пасяджэння бізнес-форуму, арганізаванага Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Яго тэма — «Жанчыны ў бізнесе — патэнцыял для развіцця дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана» — поўнасцю сябе апраўдала. Прадстаўнікі бізнес-супольнасці абедзвюх краін, парламентарыі, кіраўнікі міністэрстваў, канцэрнаў, устаноў і арганізацый вызначылі прыярытэты развіцця супрацоўніцтва ў эканоміцы. Аднак не толькі дадзеная сфера збліжае нашы народы. Як паказалі секцыйныя пасяджэнні, што адбыліся напярэдадні, краіны гатовыя ўзаемадзейнічаць і ў аграпрамысловым сектары, медыцыне, адукацыі і навуцы. Шырокія магчымасці для развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння даюць культура і турызм.

Фота Вікторыі ІВАНЧЫКАВА.

Прывітанне ўдзельнікам Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «У вашай асобе звяртаюся да ўсіх жанчын Беларусі і Узбекістана, чые дасягненні ў эканоміцы, палітыцы і грамадскім жыцці, адукацыі і навуцы, культуры і спорце садзейнічаюць паглыбленню ўзаемаразумення паміж нашымі дзяржавамі, — адзначыў беларускі лідар. — У аснове ідэі правядзення беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму ляжаць шчырае, праверанае гадамі сяброўства двух народаў і назапашаны патэнцыял стратэгічнага супрацоўніцтва. Гэтая аб'яднальная ініцыятыва жанчын заслугоўвае ўсякай падтрымкі як унікальная з'ява на постсавецкай прасторы і прыклад для іншых».

«Голас беларускіх і ўзбекскіх жанчын павінен гучаць больш ярка»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА назвала сімвалічным, што менавіта ў беларускай сталіцы сабраліся ініцыятыўныя і дзейныя ўдзельніцы, якія шчыра выступаюць за дабрабыт нашых краін і народаў. Спікер верхняй палаты парламента падзякавала Старшыні Сената Олій Мажліса Танзіле Нарбаевай за цудоўную ідэю наконт правядзення Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму, якая мае ўсе шанцы перарасці ў магутны міжпарламенцкі, міждзяржаўны і міжрэгіянальны жаночы рух.

«Нягледзячы на адлегласці, дружалюбныя беларуска-ўзбекскія адносіны прадвызначаныя перапляценнем лёсаў нашых народаў, якія жывуць на прасторах Еўразійскага кантынента, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Важна, што повязі сяброўства, паразумення, добрасычлівасці захоўваюцца і дагэтуль. Беларусь разглядае Узбекістан як ключавога партнёра ў рэгіёне Цэнтральнай Азіі і імкнецца да пашырэння канструктыўнага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах. Цяперашні характар палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва нашых краін — вынік высокага ўзроўню адносін кіраўнікоў нашых дзяржаў».

На думку Старшыні Савета Рэспублікі, у сучасным свеце не так шмат прыкладаў такога ўзроўню ўзаемнага даверу і павагі, які ёсць паміж Беларуссю і Узбекістанам, кіраўнікамі дзяржаў і народамі. «Сапраўднае сяброўства, салідарнасць, падтрымка — доля моцных, непахісных духам нацый, якія выразна ўсведамляюць сваё вышэйшае прызначэнне, сваю місію ў гэтым складаным свеце, — удакладніла яна. — Тых, хто беражэ і абараняе традыцыйныя каштоўнасці, адстойвае права на нацыянальную ідэнтычнасць, на ўласны шлях развіцця. Сёння нам, брацкім беларускаму і ўзбекскаму народам, асабліва важна шанаваць і берагчы нашы добрыя чалавечыя адносіны. Нас звязвае мінулае, сучаснасць і, упэўненая, агульная будучыня, у якой мы, як і раней, будзем паслядоўна прасоўваць і ўвасабляць у жыццё ідэі ўсеагульнай бяспекі, стваральнай працы і ўстойлівага развіцця, збалансаванага справядлівага свету раўнапраўных суверэнных дзяржаў».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў Першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму, спікер сказала, што такія фарматы мерапрыемстваў з'яўляюцца магутнай сілай, здольнай пераадольваць любыя супярэчнасці, знаходзіць мудрыя перспектыўныя рашэнні, якія яшчэ больш аб'ядноўваюць нашы народы. Дзякуючы форуму адкрываюцца новыя магчымасці для павышэння дынамікі двухбаковых адносін.

«Акрамя таго, форум служыць пляцоўкай для выбудоўвання ўзаемадзеяння паміж ключавымі жаночымі, а таксама маладзёжнымі структурамі Беларусі і Узбекістана, — адзначыла Наталля Качанава. — Не сумняваюся, гэта толькі старт і атрыманыя вынікі ў некалькі разоў прымножацца, бо тэма жаночага прадпрымальніцтва — сапраўды вельмі важная і ўсёабдымная: яна ахоплівае практычна ўсе сферы жыццядзейнасці і з'яўляецца важкім складнікам сацыяльна-эканамічнага развіцця».

Жыццё паказавае — ролю жанчыны ў любой сферы жыццядзейнасці нельга як недаацаніць, так і пераацаніць. «Патэнцыял узаемадзеяння беларускіх і ўзбекскіх жанчын-прадпрымальніц сапраўды велізарны, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Практычна па кожным кірунку нашы краіны маюць невымерныя рэзервы. І нам з вамі ёсць над чым працаваць і да чаго імкнуцца. Створаны ўмовы і ёсць магчымасць для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, якое дае магчымасць забяспечыць штогадовы рост тавараабароту, развіццё вытворчай кааперацыі і павелічэнне долі інавацый».

Наталля Качанава перакананая, што голас беларускіх і ўзбекскіх жанчын павінен гучаць больш ярка з айчынных і замежных трыбун, а жаночыя рухі дзвюх краін — займаць актыўную пазіцыю па кансалідацыі сусветнай жаночай грамадскасці.

«Мы ганарымся дасягненнямі Беларусі»

Як падкрэсліла **Старшыня Сената Олій Мажліса Танзіла НАРБАЕВА,** для Узбекістана Беларусь з'яўляецца адным з традыцыйных, ключавых партнёраў на прасторы СНД. «Супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі паступальна развіваецца ў духу сяброўства, партнёрства, — удакладніла яна. — Усе мы добра ведаем і паважаем эканамічны патэнцыял магчымасцяў Рэспублікі Беларусь з яе развітой прамысловай вытворчасцю, айці-сегментам, сферай паслуг, сельскай гаспадаркай. Краіна пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі дасягнула высокіх вынікаў у лёгкай прамысловасці, машынабудаванні, дрэваапрацоўцы, нафтахімічнай, фармацэўтычнай галінах, таксама ў вытворчасці прадуктаў харчавання. Мы як верныя сапраўдныя вашыя сябры ганарымся ўсімі дасягненнямі, якія мае Беларусь. Ваша краіна можа па праве ганарыцца на сусветным узроўні, бо ўнутраны рынак напоўнены таварамі, выраблены беларускімі прадпрымальнікамі. Вядома, мы таксама імі карыстаемся. У нас беларускія тавары вельмі шануюцца».

Спікер верхняй палаты парламента Узбекістана адзначыла, што ў такіх працэсах актыўна бяруць удзел жанчыны-прадпрымальніцы. «Яны складаюць значны сегмент грамадства Беларусі, — упэўненая Танзіла Нарбаева. — Тое, што кожны трэці прадпрымальнік Беларусі — жанчына, сведчыць аб многім. Наладжванне пастаяннага ўзаемадзеяння ў сферы падтрымкі жанчын, іх актыўнага ўключэння ў прадпрымальніцкую дзейнасць мае вельмі вялікае значэнне для нашых краін. У дадзеным кантэксце правядзенне форуму стане дастойным укладам у вызначэнне новых пунктаў росту ў двухбаковых адносінах».

Парламентарыі Узбекістана бачаць запатрабаванасць ва ўмацаванні супрацоўніцтва і рэалізацыі новых сумесных мер па некалькіх кірунках. «Першы — гэта пашырэнне партнёрства ў сферы лёгкай прамысловасці, абмен перадавымі тэхналогіямі ў тэкстыльнай, швейна-трыкатажнай галіне, пашырэнне кааперацыі паміж вытворцамі тканін, адзення, абутку, футравай і скураной прадукцыі», — удакладніла яна.

Другі кірунак узаемадзеяння — развіццё сувязяў у айці-сферы, сумесная распрацоўка лічбавых прадуктаў для прадпрымальніцтва, асабліва жаночага. Узбекістан цікавіць прыцягненне жанчын і дзяўчат у лічбавую эканоміку, абмен вопытам па павышэнні адукаванасці, навыкаў жанчын у згаданай сферы. Трэці кірунак беларуска-ўзбекскага супрацоўніцтва — узмацненне кааперацыі ў сферы медыцыны і адукацыі. «Прыярытэтнымі напрамкамі ўзаемадзеяння маглі б стаць прамысловыя вытворчасці лекавых сродкаў, транспланталогія, стварэнне медыцынскіх кластараў, устаноў і філіялаў вядучых ВНУ, у тым ліку медыцынскіх», — удакладніла Танзіла Нарбаева і падзялілася, што членаў парламенцкай дэлегацыі Узбекістана ўразіла падрыхтоўка педагагічных кадраў у нашай краіне.

Агучыла спікер і чацвёрты кірунак двухбаковага партнёрства. Узбекістан разлічвае на ўкараненне новых механізмаў узаемадзеяння для развіцця сельскай гаспадаркі, харчовай прамысловасці, павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў аграрнага сектара на беларускіх прадпрыемствах і ў вышэйшых навучальных установах.

Відавочна, што Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум адкрывае новыя магчымасці для дынамічнага росту двухбаковых адносін. Па яго выніках падпісаны Дэкларацыя, 14 мемарандумаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве, уключаючы пагадненне аб стварэнні сумеснай гарбарна-абутковай вытворчасці, а таксама заключана 15 камерцыйных кантрактаў на суму 93,5 мільёна беларускіх рублёў, або 350 мільярдаў узбекскіх сумаў. Плануецца, што беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум стане традыцыйным мерапрыемствам, якое будзе праходзіць пад эгідай верхніх палат парламентаў і стане неад'емным элементам стратэгічнага беларуска-ўзбекскага партнёрства.

Вераніка КАНЮТА.

Ключавы партнёр у Цэнтральнай Азіі

У Мінску працягваюцца мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў розных сферах. Старшыня Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзіла НАРБАЕВА сустрэлася са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.

Фота БелТА.

Уладзімір Андрэйчанка заўважыў, што Узбекістан з'яўляецца для Беларусі ключавым партнёрам у Цэнтральнай Азіі. «Мы зацікаўленыя развіваць адносіны па ўсіх напрамках. За 30 гадоў з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін яны заўсёды развіваліся паступальна. Праўда, былі перыяды і ўздыму, і падзення. Але самае галоўнае, што на сёння ў нас няма нявырашаных пытанняў. І, вядома, усё гэта зроблена дзякуючы Прэзідэнтам нашых краін», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Паводле яго слоў, нашы краіны дэманструюць добры рост тавараабароту. «Але мы ні ў якім разе не павінны на другі план адсоўваць міжасабовыя адносіны. У першую чаргу, напэўна, паміж моладдзю. Таму што час сёння няпросты. Я маю на ўвазе школьныя, студэнцкія абмены, супрацоўніцтва ў галіне адукацыі. Ахова здароўя, культура, спорт — усё гэта трэба развіваць. Гэта злучальныя звёны, якія дазваляюць нам і па іншых напрамках больш актыўна працаваць. Нам трэба зберагчы галовы і душы нашых маладых людзей ад тога фальшу, які сёння ідзе, і ад чужой нам ідэалогіі», — заявіў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён падкрэсліў, што ў Беларусі шмат робіцца ў дадзеным кірунку. «Мы павінны супрацьстаяць той фальсіфікацыі, якая вядзецца з боку заходнікаў. І на гэты конт нам трэба больш актыўна працаваць у нашых міжнародных арганізацыях», — дадаў спікер.

«Наш візіт праходзіць у гістарычны час — 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Узбекістанам. Палітыка абедзвюх дзяржаў — гэта дабрабыт чалавека. Гэта ўсё, што трэба для чалавека. Працаваць так, каб кожны чалавек быў задаволены, — у гэтым заключаецца наша палітыка», — адзначыла Танзіла Нарбаева. Яна падкрэсліла, што прэзідэнты дзвюх краін знаходзяцца ў пастаянным кантакце. Па яе словах, у апошнія гады адносіны Беларусі і Узбекістана актывізаваліся: прынята спецыяльная дарожная карта па развіцці адносін паміж дзяржавамі. Цяпер яна актыўна рэалізоўваецца. «Наш тавараабарот — больш як $500 млн, ён у тры разы павялічыўся за апошні час. Але ў нас ёсць патэнцыял для павышэння яго ў разы. І ёсць яшчэ кірункі, над якімі трэба працаваць», — падкрэсліла Танзіла Нарбаева.

Кампетэнтна

Толькі на тэрыторыі Беларусі

МЗС растлумачыла, як па новым указе атрымаць або абмяняць пашпарт тым, хто пражывае за граніцай

Міністэрства замежных спраў Беларусі пракаментавала змяненні ў парадку выдачы дакументаў пасольствамі.

Указ Прэзідэнта № 278 «Аб парадку выдачы дакументаў і ажыццяўлення дзеянняў» уступае ў сілу 7 верасня. Ён уносіць змяненні ў пералік консульскіх дзеянняў і адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюць замежныя ўстановы па заявах грамадзян.

У прэс-службе МЗС праінфармавалі, што пасольствы і консульствы будуць па-ранейшаму займацца пытаннямі грамадзянства, консульскага ўліку, рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану, афармленнем пастаяннага пражывання за межамі Беларусі. Таксама яны будуць і далей выдаваць пасведчанні на вяртанне ў Беларусь, засведчваць завяшчанні, згоды, адмовы, засведчваць правільнасць копій і сапраўднасць подпісу на дакументах.

Разам з тым пасольствы і консульствы больш не ўпаўнаважаныя займацца выдачай, абменам, прадаўжэннем усіх відаў пашпартоў і ідэнтыфікацыйных картак. Такія дзеянні можна ажыццявіць на тэрыторыі Беларусі.

«Грамадзяне, якія афармілі пастаяннае пражыванне за межамі Беларусі і стаяць у замежустановах на пастаянным консульскім уліку, змогуць звяртацца па пытаннях абмену пашпартоў у галоўнае консульскае ўпраўленне МЗС або ў падраздзяленне па грамадзянстве і міграцыі УУС па месцы апошняй рэгістрацыі ў Беларусі (па месцы апошняга жыхарства бацькоў — для асоб, якія не пражывалі ў краіне)», — расказалі ў прэс-службе.

Апастыль таксама будзе прастаўляцца ў адным з кампетэнтных органаў у Беларусі (МЗС, Мінадукацыі, Мінюст і галоўныя ўпраўленні юстыцыі Мінгарвыканкама і аблвыканкамаў — у залежнасці ад тыпу дакумента). Падача дакументаў магчымая толькі асабіста ўладальнікам або іншай асобай пры прад'яўленні даверанасці, аформленай у краіне.

«Асабістая падача дакументаў у зацікаўлены орган таксама прадугледжаная па шэрагу іншых адміністрацыйных працэдур, пералічаных у адпаведным дадатку да ўказа (для атрымання даведак загса, паўторных пасведчанняў аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану (акрамя смерці) і іншага)», — дадалі ў МЗС.

Звароты, пададзеныя да ўступлення ў сілу ўказа, разглядаюцца ў парадку, які дзейнічаў раней.

Напярэдадні

Шматнацыянальная сталіца

У Мінску стартуе фестываль нацыянальных культур

Фестывалі нацыянальных культур — гэта цудоўная і ўнікальная магчымасць назіраць сучаснае сузор'е талентаў прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія жывуць і працуюць у Беларусі, магчымасць падвядзення вынікаў іх творчай дзейнасці, судакрананне з культурай іншых народаў. Яны маюць вялікае значэнне для захавання міжнацыянальнай згоды і сацыяльнай стабільнасці ў Беларусі. Пра старт XIV фестывалю нацыянальных культур больш падрабязна распавяла мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Алена ГОСЦЕВА.

«Фестываль нацыянальных культур — гэта сапраўды велізарнае, маштабнае, цікавае і ўнікальнае мерапрыемства. Адкрыццё XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур адбудзецца 9 верасня ў Верхнім горадзе на галоўнай сцэне каля ратушы. Падрыхтоўка да фестывалю праходзіць два гады. Спачатку гэта ўрачыстае адкрыццё ў Мінску, затым з кастрычніка да снежня праходзяць абласныя і Мінскі гарадскі адборачныя туры. Сёлета адборачныя туры і адкрыццё фестывалю будуць праходзіць пад эгідай Года міру і стваральнай працы. Цяпер мы збіраем заяўкі з абласцей, ад горада Мінска аб датах і месцы правядзення адборачных тураў», — адзначыла Алена Госцева.

На яе думку, адкрыццё фестывалю стане сапраўды відовішчнай падзеяй. На ім будзе прадстаўлена культура 24 нацыянальнасцяў, выстава нацыянальных дыяспар. «Усяго ў Беларусі пражывае 156 нацыянальнасцяў, але зарэгістраваных аб'яднанняў не так шмат».

Канцэртная праграма і выстава будуць доўжыцца з 12.00 да 17.00, урачыстае адкрыццё адбудзецца ў 14.00. У адкрыцці фестывалю возьме ўдзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Кухараў, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, старшыня Кансультатыўнага савета.

«На выставах можна будзе не толькі паглядзець нацыянальную культуру, але і прымераць нацыянальны касцюм, пакаштаваць нацыянальныя стравы. Будзе працаваць фотазона. Спецыяльным госцем канцэрта стане фальклорны гурт Neevo Санкт-Пецярбургскага таварыства эстонскай культуры, — расказала Алена Госцева. — Яны прыедуць па запрашэнні старшыні культурна-асветнага грамадскага аб'яднання «Эстонская абшчына «Ластаўка» ў Беларусі Олівера Манглуса».

У склад журы фестывалю ўвойдуць вядомыя дзеячы культуры, якія ўжо працавалі на праекце: Святлана Гуткоўская, Яўген Сахута, Ірына Грамовіч, Аляксандр Крамко і іншыя майстры.

«Наша задача — выявіць аўтэнтычную, сапраўдную культуру, знайсці сапраўдных носьбітаў культуры. Самае галоўнае — правільнае ўяўленне нацыянальнай культуры. Галоўная задача фестывалю — гэта яднанне, згуртаванасць усіх нацыянальнасцяў», — акцэнтавала ўвагу Алена Госцева.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Па сутнасці

СПРАВА ДЛЯ ДУШЫ

Пацягнула восенню. Нават адчуваецца пах залатой пары. Яшчэ лісце не шапаціць пад нагамі, але ўранку і вечарамі пацягвае прахалодай, свежасцю, нават сырасцю. Памятаю, як у дзяцінстве цягнула дымам — так нагадвалі аб сабе тарфяныя залежы, а яшчэ — бульбай. Гэта быў непаўторны пах. Не той, што дорыць патэльня, калі на ёй шкварчаць дранікі.

З аднаго боку — прыемна, бо асноўныя сельскагаспадарчыя турботы завершаныя. З іншага — крыху сумна. Як бывае, калі здараецца паспяхова завяршыць справу. Так і пра лета. Заўжды насычанае, руплівае, да прыемнай стомленасці. А якая гарачыня была! Нібыта прырода адлюстроўвала геапалітычны клімат. Пыхкалі мы ад той спякоты. А прайшла — і ўжо сумна. І буслоў не хапае, і птушыныя канцэрты сціхлі. Калі і пачуеш, то адзінокага «саліста». І лес нібы просіць прабачэння ў чалавека, загладжвае сваю віну, адорвае баравікамі ды познімі лісічкамі. Лета, да сустрэчы... А самыя добрыя імгненні застануцца з намі ў памяці, у сэрцы. І ў матэрыяльных формах: на фота, у сацыяльных сетках.

Любяць нашы людзі і родныя краявіды, і зямлю, і сваю працу. Цяжкую і такую патрэбную. Я пра хлебаробаў. Ёсць такое шаблоннае ўспрыманне: «Цік-ток» для бесклапотных падлеткаў і ўрбаністычна настроенай моладзі, «Інстаграм» — для свецкай тусоўкі. На іх старонках шмат ботаксу, кавярань ды самакатаў. Беларусы гэты штучны кірмаш пыхлівасці напоўнілі больш душэўнымі і светлымі паняццямі. Дзеляцца шчырымі ўражаннямі ад сваёй работы. Кіраўнік дзяржавы падчас наведвання дзіцячага тэхнапарку звярнуўся да школьнікаў ды студэнтаў. І сказаў вельмі важныя словы пра тое, што калі чалавек абірае справу для душы, то і работа будзе прыносіць задавальненне. А калі гармонія ўнутры, то яна паўсюль.

Гледзячы на марафон фотаздымкаў ды пастоў у сацсетках беларусаў, адчуваю нават гонар за суайчыннікаў. Мы — сапраўдныя!!! Не цураемся мазалёў на сваіх далонях, не саромеемся свайго нялёгкага хлеба, тых стомленых твараў хлебаробаў. Мы падабаем не брыдкія карцінкі, не «лёгкія» жарты, а сапраўдную Беларусь. Вось камбайнер у салоне новага КЗС ад «Гомсельмаша», жанчына пазіруе на фоне акуратных цюкоў, дзіця сярод збожжавых палеткаў і з васільком у руках. Звычайнае фота. А які сэнс! Глыбінны. У руках моладзі — наша васільковая Беларусь. Дарэчы, менавіта моладзь — хэдлайнеры трэнду — дзеліцца добрым настроем на рабоце. Новаму пакаленню аграрыяў не саступаюць і ўжо сталыя прафесіяналы, бо і яны насамрэч любяць ды ганарацца сваёй справай. А цяпер асвоілі прасторы сацыяльных сетак. Ну што ж, і добра. Замест экспансіі постмадэрновых патэрнаў і ўвогуле філасофіі лежабокаў беларусы нават віртуальнае поле зносін замест смецця-пустаселля засялі добрым насеннем.

Гэта ж не пастаноўка, не ролік ад заходніх піярагентаў. Гэты мэйнстрым, тон задаюць самі беларусы. Чым жывуць, тое і дэманструюць. Ці падхопяць трэнд хлебаробаў працаўнікі іншых сфер? Калі такія ж шчаслівыя ад свайго месца работы, то абавязкова. Вось яна, сапраўдная краіна для жыцця. Беларусь, асвечаная сонцам.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Энрыке Тарыа прысуджаны ў ЗША да 22 гадоў турмы за беспарадкі ў Капітоліі

Экс-лідар ультраправага руху Proud Boys («Гордыя хлопцы») Энрыке Тарыа прысуджаны да 22 гадоў турэмнага зняволення па справе аб штурме Капітолія 6 студзеня 2021 года. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». Як адзначаецца ў матэрыяле, 39-гадовага Тарыа не было ў Вашынгтоне падчас беспарадкаў, але, як палічыў суд, ён каардынаваў дзеянні членаў свайго руху. Пракуроры назвалі яго дзеянні «ўсвядомленым тэрарыстычным актам», за што яму пагражала пакаранне ў выглядзе 33 гадоў турэмнага зняволення. Гэта самы строгі прысуд па гучнай справе ў ЗША ў дачыненні да беспарадкаў у Капітоліі. Групоўка Proud Boys — прыхільнікі экс-прэзідэнта Злучаных Штатаў Дональда Трампа. Іншыя яе ўдзельнікі Дамінік Пецола і Закарыя Рэл былі прысуджаны адпаведна да 10 і 15 гадоў турэмнага зняволення. Джо Бігс атрымаў 17 гадоў, Ітан Нордзін прысуджаны да 18 гадоў турмы. Па абвінавачанні ў беспарадках у Капітоліі было арыштавана больш за 1100 чалавек. Расследаванне яшчэ працягваецца — ФБР спрабуе знайсці 14 удзельнікаў беспарадкаў, знятых на відэа, якія нападаюць на паліцэйскіх ці прадстаўнікоў СМІ.

Дажджы выклікалі небывалую паводку ў Грэцыі, Балгарыі і Турцыі



Моцныя ліўні абрынуліся на гэтыя краіны. У выніку паводкі загінула сама меней сем чалавек, паведаміла Euronews. У Грэцыі паліцыя забараніла рух у горадзе Волас, найбліжэйшым горным раёне Пеліён і на курортным востраве Скіятас. З-за рэкордных дажджоў патокі вады вышынёй да метра ліліся па вуліцах і змяталі машыны. У многіх раёнах адбылося адключэнне электрычнасці. Прэм'ер-міністр Балгарыі Мікалай Дзенка паведаміў, што на поўначы краіны два чалавекі загінулі і трое прапалі без вестак пасля таго, як шторм выклікаў паводку на паўднёвым чарнаморскім узбярэжжы. Разлівы рэк нанеслі сур'ёзны ўрон дарогам і мастам. Двое адпачывальнікаў былі вынесеныя патокам, які пранёсся праз лагер для кемпінга на паўночным захадзе Турцыі. Міністр унутраных спраў Турцыі Алі Ерлікая паведаміў, што яшчэ чатыры чалавекі прапалі без вестак пасля таго, як паводка захліснула турыстычны лагер у правінцыі Кыркларэлі, недалёка ад граніцы з Балгарыяй. У Стамбуле, найбуйнейшым горадзе Турцыі, праліўны дождж затапіў вуліцы і дамы ў двух раёнах, у выніку чаго загінулі сама меней два чалавекі. Некаторыя станцыі метро былі закрытыя.

У Індыі прапанавалі змяніць назву краіны



Урад, які ўзначальвае Нарэндра Модзі, мае намер унесці рэзалюцыю аб змене афіцыйнай назвы Індыі на Бхарат падчас спецыяльнай сесіі парламента, запланаванай на 18—22 верасня. Аб гэтым паведаміла выданне Times Now са спасылкай на крыніцы ў кабінеце міністраў. Дэпутат ад партыі Радж Сабха Нарэш Бансал заявіў, што назва «Індыя» з'яўляецца сімвалам каланіяльнага рабства і павінна быць выключана з Канстытуцыі. Выданне The Economic Times піша, што запрашэнні на вячэру ў рамках G20 былі падпісаны ад імя прэзідэнта Бхарата. Многія члены кіруючай партыі падтрымліваюць ініцыятыву аб перайменаванні Індыі.

Се СЯАЮН:

«Беларусь бярэ актыўны ўдзел у «Адным поясе, адным шляху»

Пра поспехі, глабальны маштаб, жыццёвую сілу «Аднаго пояса, аднаго шляху», аб плённым узаемадзеянні Беларусі і Кітая ў эксклюзіўным інтэрв'ю для «Звязды» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН.

— Якім чынам была вылучана ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях»?

— Шаўковы шлях — гэта сукупнасць старажытных камерцыйных гандлёвых маршрутаў, якія пачыналіся ў Кітаі і злучалі краіны Азіі, Афрыкі і Еўропы, падзяляліся на наземны і марскі шляхі. Ён у асноўным выкарыстоўваўся для экспарту шоўку, фарфору і іншых тавараў, вырабленых у Кітаі, і імпарту каштоўнасцяў, лекавых траў, спецый і сельскагаспадарчых культур з іншых краін. Пазней ён стаў галоўным шляхам абмену паміж Усходам і Захадам у эканамічнай, палітычнай, культурнай і іншых галінах. Восенню 2013 года падчас сваіх візітаў у Казахстан і Інданезію Старшыня КНР Сі Цзіньпін вылучыў важныя ініцыятывы сумеснага будаўніцтва «Эканамічнага пояса Шаўковага шляху» і «Марскога Шаўковага шляху XXI стагоддзя», накіраваныя на пераемнасць і перадачу духу Шаўковага шляху, сумеснае стварэнне з усімі краінамі адкрытай платформы супрацоўніцтва для надання новага імпульсу сусветнаму супрацоўніцтву і развіццю. Менавіта такім чынам з'явілася ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях».

— Якія яе асноўныя характарыстыкі?

— Ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» мае наступныя чатыры асноўныя асаблівасці. Па-першае, адкрытасць. Міжнароднае супрацоўніцтва ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» заснавана на маршруце старажытнага Шаўковага шляху, але не абмяжоўваецца яго рамкамі. У ініцыятыве могуць удзельнічаць усе краіны свету, а таксама міжнародныя і рэгіянальныя арганізацыі, каб вынікі сумеснага будаўніцтва маглі прынесці карысць больш шырокай частцы свету.

Па-другое, інклюзіўнасць. Міжнароднае супрацоўніцтва па ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях» выступае за гармонію і талерантнасць паміж цывілізацыямі, паважае шляхі і мадэлі развіцця, абраныя рознымі краінамі, накіраванае на заахвочванне дыялогу паміж рознымі цывілізацыямі, а таксама імкнецца да ўсёабдымнасці і мірнага суіснавання.

Па-трэцяе, рыначная арыентацыя. Міжнароднае супрацоўніцтва ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» развіваецца па законах рынку і агульнапрынятых міжнародных правілах, цалкам раскрывае вырашальную ролю рынку ў размеркаванні рэсурсаў і месца розных прадпрыемстваў, а таксама заахвочвае ўрады адыгрываць сваю ролю.

Па-чацвёртае, узаемная выгада. Міжнароднае супрацоўніцтва па ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях» прытрымліваецца прынцыпу ўзаемнага выйгрышу, улічвае інтарэсы і заклапочанасці ўсіх ба-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Бел ТА.

коў, імкнецца да пункта перасячэння інтарэсаў і найбольшага агульнага выніку супрацоўніцтва, каб у поўнай меры рэалізаваць перавагі і патэнцыял усіх бакоў.

— Якія поспехі былі дасягнутыя ў ходзе рэалізацыі ініцыятывы?

— Сёлета спаўняецца дзесяць гадоў ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях». За гэты час яна прайшла шлях ад ідэі да дзеяння, ад бачання да рэчаіснасці. Яна накіраваная на абарону глабальнай сістэмы свабоднага гандлю і адкрытай сусветнай эканомікі, на міжрэгіянальнае супрацоўніцтва ў больш шырокім маштабе, на больш высокім і глыбокім узроўні, а таксама на абмен і ўзаемнае навучанне паміж цывілізацыямі. Ініцыятыва абагульняе ідэалы і выдатныя памкненні чалавецтва, прыносіць пазітыўную энергію міру і развіцця ва ўсім свеце. Кітай ужо падпісаў больш за 200 дакументаў аб супрацоўніцтве па сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху» са 151 краінай і 32 міжнароднымі арганізацыямі. Сумеснае будаўніцтва ўнесена ў шэраг вынікових дакументаў розных шматбаковых механізмаў, такіх як ААН, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва і Арганізацыя Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва, атрымала шырокае прызнанне міжнароднай супольнасці.

У галіне ўзаемасувязі і ўзаемнага злучэння пасля шматгадовага развіцця была сфарміравана асноўная структура — «шэсць калідораў, шэсць шляхоў, мноства дзяржаў, мноства партоў». Рэалізаваны шэраг знакавых праектаў і дасягнуты істотны прагрэс. Кантэйнерны цягнік «Кітай — Еўропа» ўжо стаў важным выбарам для міжнародных лагістычных наземных перавозак. Ён вядомы як «караван стальных вярблюдаў» і ўнёс выдатны ўклад у стабілізацыю міжнародных вытворча-паставачных ланцужкоў.

У галіне садзейнічання развіццю ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» цесна звязала краіны і рэгіёны ўздоўж яе маршруту і ажыццявіла шырокае супрацоўніцтва ў такіх галінах, як фінансы, гандаль, інвестыцыі, ахова навакольнага асяроддзя і гэтак далей, што эфектыўна спрыяла развіццю дзяржаў. У той жа час бесперапынна ўмацоўваецца спалучэнне нормаў і стандартаў паміж ініцыятывай і рознымі краінамі, міжнароднымі арганізацыямі, бесперапынна павышаецца ўзровень лібералізацыі і спрашчэння працэдур гандлю і інвестыцый. За дзесяць гадоў ініцыятыва сумеснага будаўніцтва «Адзін пояс, адзін шлях» стварыла інвестыцыі ў суме прыкладна аднаго трыльёна долараў ЗША, рэалізавана больш за 3000 праектаў супрацоўніцтва, створана 420 тысяч працоўных месцаў у краінах уздоўж маршруту, дзякуючы чаму каля 40 мільёнаў чалавек пазбавілася ад беднасці, розныя дзяржавы атрымалі больш магчымасцяў для развіцця, а вынікі эканамічнага развіцця прынеслі яшчэ больш карысці народам.

У галіне ўзаемасувязі паміж народамі ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» актыўна садзейнічала абмену і ўзаемнаму навучанню паміж цывілізацыямі краін і рэгіёнаў уздоўж маршруту. Праведзена мноства мерапрыемстваў, такіх як «Год культуры» і фестывалі мастацтваў. У 159 краінах і рэгіёнах заснаваны інстытуты Канфуцыя і класы Канфуцыя, у 19 краінах адкрыліся «Майстэрні Лу Баня». Паспяхова функцыянуюць міжнародныя саюзы тэатраў, музеяў, бібліятэк, мастацкіх галерэй Шаўковага шляху, а таксама Міжнародны саюз навуковых арганізацый «Аднаго пояса, аднаго шляху». Усё гэта ўмацавала абмен, паразуменне і прызнанне паміж рознымі культурамі. Кітай таксама актыўна ажыццяўляе «малыя, але выдатныя» праекты будаўніцтва для паляпшэння ўзроўню жыцця насельніцтва, бесперапынна садзейнічаючы ўмацаванню дружалюбных узвязяў паміж народамі розных краін.

— Чаму ініцыятыва стала важным глабальным праектам сучаснасці?

— Цяпер шматпалярнасць, эканамічная глабалізацыя і культурная разнастайнасць паглыблена развіваюцца, чалавецтва поўнае надзей. Але ў той жа час, паколькі некаторыя краіны праводзяць палітыку гандлёвага пратэкцыянізму і злоўжываюць аднабаковымі санкцыямі, у спалучэнні з тым, што свет толькі што перажыў пандэмію COVID-19, аднаўленне глабальнай эканомікі ідзе павольна, і разрыў у развіцці розных краін стаў яшчэ больш прыкметны. У дадзеным кантэксце ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» адпавядае гістарычнай тэндэнцыі эканамічнай глабалізацыі, неад'емным патрабаванням рэформы сістэмы глабальнага кіравання, памкненню ўсіх краін, асабліва вялікай колькасці тых, якія развіваюцца, да міру і развіцця, дапамагае ім у поўнай меры выкарыстаць свае перавагі і вырашаць праблемы. Акрамя таго, ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» прасоўвае дух адкрытасці, інклюзіўнасці, узаемнага навучання і абмену вопытам, прытрымліваецца мэты ўзаемнай выгады і агульнага развіцця, прынцыпаў сумеснага абмеркавання, будаўніцтва і выкарыстання, канцэпцыі адкрытасці, экалагічнасці і непадкупнасці, імкнецца да высокіх стандартаў, устойлівасці і зыходзіць з інтарэсаў народа, выкарыстоўвае высакаякаснае развіццё ў якасці шляху, што дэманструе агульныя каштоўнасці ўсяго чалавецтва, такія як мір, развіццё, роўнасць, справядлівасць, дэмакратыя і свабода. У той жа час яна адпавядае асноўным прынцыпам міжнародных адносін, такія як узаемная павага, роўнае абыходжанне і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Таму, як толькі ініцыятыва была вылучана, шэраг краін актыўна адгукнуўся на яе і ўзяў у ёй шырокі ўдзел. Цяпер яна ўжо стала самай папулярнай платформай глабальнага супрацоўніцтва.

— Як вы ацэньваеце ўдзел Беларусі ў «Адным поясе, адным шляху», якія сумесныя праекты ўдалося рэалізаваць нашым краінам?

— Беларусь адной з першых краін адгукнулася і бярэ актыўны ўдзел у «Адным поясе, адным шляху». Нашы дзяржавы падпісалі шэраг дакументаў аб супрацоўніцтве ў рамках ініцыятывы, якія паглыбілі ўзаемадзеянне паміж дзвюма краінамі ў такіх сферах, як гандаль, інвестыцыі, прамысловасць, сельская гаспадарка, мытня, транспарт і міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Гэта прынесла рэальную ўзаемную выгаду. Беларусь мае выгаднае геаграфічнае становішча і з'яўляецца важным транспартным вузлом «Аднаго пояса, аднаго шляху». У той жа час, як член Еўразійскага эканамічнага саюза яна таксама мае вялікае значэнне для садзейнічання спалучэнню і супрацоўніцтву паміж будаўніцтвам «Аднаго пояса, аднаго шляху» і ЕАЭС.

У рамках ініцыятывы Кітай і Беларусь рэалізавалі шэраг узаемавыгадных і плённых сумесных праектаў, найважнейшым з якіх з'яўляецца Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Ён як жамчужына «Аднаго пояса, аднаго шляху» і знакавы праект кітайска-беларускага практычнага супрацоўніцтва, дзякуючы ўласнай перадавой бізнес-канцэпцыі, найвышэйшаму дзелавому асяроддзю і сфарміраванаму дапаможнаму аснашчэнню, становіцца найлепшым выбарам для прадпрыемстваў з усяго свету для інвестыцый і развіцця бізнесу ў Беларусі. У апошнія гады дзякуючы агульнаму клопату і садзейнічанню кіраўнікоў дзвюх дзяржаў, індустрыяльны парк актыўна рэагаваў на выклікі, спароджаныя пандэміяй COVID-19 і комплекснымі знешнімі фактарамі, працягвае стабільна развівацца і дасягнуў многіх выдатных вынікаў. Работа па прыцягненні прадпрыемстваўрэзідэнтаў і інвестыцый у Парку ідзе планамерна, іх колькасць павялічваецца насуперак выклікам. На сённяшні дзень у Парку 113 прадпрыемстваў з 16 краін свету, а аб'ём заяўленых інвестыцый складае каля 1,3 мільярда долараў ЗША. Прадпрыемствы занятыя ў такіх галінах, як машынабудаванне, біяфармацэўтыка, электронная камерцыя, новыя матэрыялы, традыцыйная кітайская медыцына, штучны інтэлект і развіццё сетак 5G. Летась агульны кошт прамысловай вытворчасці прадпрыемстваў-рэзідэнтаў Парка дасягнуў 456,1 мільёна беларускіх рублёў, павялічыўшыся ў параўнанні з папярэднім годам на 53,3 працэнта, выручка ад рэалізацыі тавараў, будаўніцтва, паслуг і г. д. дасягнула 709,3 мільёна беларускіх рублёў, павялічыўшыся на 90,1 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам. Экспарт прадукцыі дасягнуў 168,4 мільёна долараў ЗША, павялічыўшыся больш чым на 30 працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам. Агульны чысты прыбытак прадпрыемстваў склаў 34,1 мільёна беларускіх рублёў, працягваючы расці. Падатковыя зборы прадпрыемстваў дасягнулі 80,4 мільёна беларускіх рублёў, павялічыўшыся на 123,6 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам. Колькасць занятых на прадпрыемствах Парка дасягнула 2149 чалавек, а іх сярэдні даход перавысіў сярэдні ўзровень заработнай платы ў Беларусі амаль удвая.

Акрамя Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, абедзве краіны ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» таксама разам рэалізавалі такія сумесныя праекты, як СЗАТ «Белджы», Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат і гэтак далей. У тым ліку СЗАТ «Белджы» як беларуска-кітайскае сумеснае прадпрыемства не толькі ўвасобіла ў жыццё мару Беларусі аб аўтамабілі айчыннай вытворчасці, але і прадае машыны ў Расію і іншыя краіны СНД, стаўшы яркай візітнай карткай беларускай легкавой аўтамабільнай прамысловасці.

Праект «Высокатэхналагічная аграпрамысловая вытворчасць поўнага цыкла», што ажыццяўляецца Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй за кошт кітайскага льготнага крэдыту, будаўніцтва якога было здзейснена кітайскімі прадпрыемствамі, з'яўляецца не толькі першым прадпрыемствам па вытворчасці амінакіслот, першым экспартна арыентаваным і імпартазамяшчальным праектам у галіне глыбокай перапрацоўкі збожжа ў Беларусі, але і першым буйным аграпрамысловым прадпрыемствам поўнага цыкла ў СНД, які аб'ядноўвае захоўванне збожжа, вытворчасць розных кармоў і амінакіслот. Гэта стала яшчэ адным узорам практычнага супрацоўніцтва паміж двума бакамі.

У рамках праекта будаўніцтва сацыяльнага жылля пры дапамозе ўрада Кітая ў абласцях Беларусі і Мінску было ўзведзена 38 будынкаў з 3286 кватэрамі агульнай плошчай амаль 200 тысяч квадратных метраў. Гэта дазволіла палепшыць жыллёвыя ўмовы больш як дзесяці тысячам чалавек з 3286 сем'яў. Цяпер за кошт бязвыплатнай кітайскай дапамогі актыўна вядзецца рэалізацыя праектаў «Нацыянальны футбольны стадыён» і «Басейн міжнароднага стандарту», якія знаходзяцца пад асабістай апекай і прасоўваннем Старшыні Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Чакаецца, што іх будаўніцтва будзе завершана да канца 2024 года, яны стануць самымі сучаснымі і буйнымі спартыўнымі аб'ектамі Беларусі.

Усе гэтыя праекты не толькі стварылі вялікую колькасць працоўных месцаў і прынеслі велізарную эканамічную выгаду Беларусі, але і запоўнілі прабелы ў адпаведных галінах, а таксама дазволілі самому беларускаму народу падзяліць вынікі супрацоўніцтва ў кітайска-беларускім сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху». Гэта ў поўнай меры прадэманстравала дружалюбныя пачуцці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі абодвух бакоў кітайска-беларускае ўзаемадзеянне ў сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху» будзе яшчэ больш паглыблена развівацца, дасягаць усё больш значных вынікаў і прыносіць яшчэ больш карысці народам дзвюх краін.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

(Поўны тэкст на партале zviazda.by)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 ВЕРАСНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15961)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Дзмітрый КАРОЛЬ:

«Я заўсёды марыў пра вялікую сцэну»

Тэлепраект «Зорны дыліжанс» даў яму старт у музыцы. Удзел у беларускай «Фабрыцы зорак» разам з Палінай Смолавай, Германам Цітовым, Кацяй Іванчыкавай, Дзмітрыем Калдуном надалі амбіцыйнаму хлопцу з берасцейскага Лагішына ўпэўненасці і бясцэннага досведу. Сёння наш герой працягвае займацца творчасцю і развівае свой бізнес, а таксама вядзе здаровы лад жыцця і ўдзельнічае ў дабрачынных канцэртах. Спецыяльна для «Чырвонкі. Чырвонай змены» Дзмітрый Кароль падзяліўся навінамі са свайго жыцця, раскрыў некаторыя сакрэты творчай кухні і расказаў, што прымусіла яго кардынальна змяніць погляд на многія рэчы.

Знаёмства на тэлепраекце з такімі ж, як і ён, узыходзячымі зоркамі беларускай эстрады ў далёкім 2005-м і прызнанне публікай стала адной з самых важных падзей у творчай кар'еры спевака.

— Вельмі хочацца ў чарговы раз сказаць маладым артыстам, якія не вераць у тое, што можна без грошай і сувязяў чагосьці дамагчыся, — гэта ўсё рэальна, гэта магчыма, і гэта праўда! — упэўнены наш герой. — Галоўнае — спрабаваць сябе ўсюды, паказваць сваю творчасць свету, і абавязкова знойдзецца чалавек, які вас заўважыць і падтрымае.

Хлопец прызнаецца, што абсалютна сумленна прайшоў усе адборачныя туры, выйшаў у фінал і ў выніку стаў уладальнікам трэцяга месца на гэтым тэлепраекце. Ён удзячны тэлеканалу СТБ, народнаму артысту Беларусі Аляксандру Рыгоравічу Ціхановічу і ўсім, хто браў удзел у стварэнні праекта.

— Я ўдзячны за тое, што далі нам магчымасць заявіць пра сябе на ўсю краіну. На гэтым праекце была запісана мая першая сольная песня «Чаму», якую я выконваю на сваіх выступленнях і цяпер, — гаворыць вакаліст.

— А што было першым: музыка ці сфера гандлю? І як вы ўсё разам сумяшчаеце?

— Вядома ж, першай у маім жыцці была музыка! Я нават і не думаў раней, што змагу і буду працаваць яшчэ і ў сферы гандлю. Продаж электраўстановак — вельмі цікавая дзейнасць, як аказалася. Мне гэта падабаецца, бо тут я штодня маю стасункі з творчымі людзьмі — дызайнерамі, архітэктарамі, тымі, хто стварае прыгожыя і цікавыя інтэр'еры.

Дзмітрыю было цяжка сумяшчаць творчасць і бізнес. Нават на некалькі гадоў ён быў вымушаны цалкам закінуць спевы і пагрузіцца ў іншую сферу, але ўсё ж з часам душа сваё абараніла.

Спяваць хлопец пачаў рана. Ён успамінае, як у дзіцячым садку ладзілі ранішнікі.

— Я і спяваў, і на лыжках іграў, і быў дырыжорам нашага сур'ёзнага калектыву *(усміхаецца)*.

Бацькі заўсёды падтрымлівалі сына. Мама Дзмітрыя Галіна Васільеўна — таксама музыкант па прафесіі, таму яму было з каго браць прыклад.

— У маці вельмі прыгожы глыбокі голас, яна любіць спяваць лірыку. Я таксама гэта ўвабраў ад яе. Думаю, што тое яскрава прасочваецца ў маёй творчасці.

— А як жа музыка прыйшла ў ваша жыццё ў прафесійным плане?

— Я заўсёды марыў пра вялікую сцэну. Паехаў паступаць у вучылішча мастацтваў у Гродне толькі з-за таго, што на той час у Беларусі гэта была адзіная навучальная ўстанова, дзе з'явілася аддзяленне «Эстрадныя спевы».

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Бачыць мэту

СТУДАТРАДЫ Ў 2023-М: ПРАЦЯГ НАЙЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Студэнцкі атрад — гэта не толькі часовыя працоўныя брыгады, але і выдатная школа падрыхтоўкі будучых высакакласных спецыялістаў, база для духоўнага і творчага развіцця маладога пакалення беларусаў. Менавіта гэтыя словы сталі лейтматывам прэс-канферэнцыі «Студатрады летам 2023. Дзейнасць і жыццё». «Вынікі трэцяга працоўнага семестра мы падводзім восенню. У кастрычніку будуць папярэднія вынікі ў штабах працоўных спраў установу вышэйшай адукацыі, тэрытарыяльных, абласных штабах студэнцкіх атрадаў. Закрыццё трэцяга працоўнага семестра папярэдне плануем на лістапад», — распавяла камісар Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Анастасія Яленская. Якія ж папярэднія вынікі гэтага сезона працоўнай актыўнасці моладзі?

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота БелТА.

Даніна пашаны

Зрабі свой унёсак у агульную справу

Пабудуем патрыятычны цэнтр у Брэсцкай крэпасці разам! Такі заклік размешчаны на сайце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Нагадаем, Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка падтрымаў ініцыятыву аб стварэнні на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі.

У адпаведнасці з рашэннем Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Брэсцкае абласное ўпраўленне капітальнага будаўніцтва вызначана заказчыкам на праектаванне і будаўніцтва першай чаргі аб'екта. Праектам стварэння цэнтра прадугледжваецца правядзенне рэканструкцыі казарменнага памяшкання пад пражыванне 200 навучэнцаў, рэканструкцыя казематаў тэнальнага фронту Кобрынскага ўмацавання пад навучальныя класы, рэканструкцыя сталовай на 200 пасадачных месцаў, добраўпарадкаванне зоны летніх палатачных лагераў на 200 месцаў і ціра, ваенна-спартыўных і гульнявых плошчаў паўночна-заходніх варот крэпасці. Таксама запланавана рэканструкцыя Заходняга форта пад забаўляльна-асветніцкі комплекс адначасовага знаходжання да 500 чалавек, добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Першая чарга будзе прадугледжваць рэканструкцыю казармы пад інтэрнат і стварэнне спартыўнай інфраструктуры.

У мэтах акумулявання грашовых сродкаў, якія паступілі на гэтыя мэты ад грамадскасці і спонсараў, адкрыты дабрачынны рахунак.

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»

BY96 AKBB 3135 0000 0028 1510 0000 — дабрачынны рахунак ЦБП № 510 ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Мінск

BIC AKBBBY2X

Уліковы нумар падаткаплацельшчыка (УНП) 102275857

Аб'ектам будаўніцтва адукацыйна-аздараўленчай установы «Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі» на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці прысвоены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. Адпаведны Указ № 257 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 жніўня. Згодна з ім, да работ на гэтых аб'ектах будуць прыцягнуты маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў. Гэты дакумент будзе садзейнічаць працоўнаму выхаванню моладзі, фарміраванню ў яе пачуцця датычнасці да гісторыі роднай краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
7 09 2023 г.

СТУДАТРАДЫ Ў 2023-М: ПРАЦЯГ НАЙЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Фота БелТА.

ЧАСОВАЯ ЗАНЯТАСЦЬ ПАДЛЕТКАЎ — ЦЯГАМ УСЯГО ГОДА

Увогуле, з пачатку года часова працаўладкавана больш за 40 тысяч юнакоў і дзяўчат, паведаміла **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алёна ДАКУКІНА**. Ключавыя напрамкі, дзе яны праяўлялі сябе актыўна, — сфера паслуг, сельскагаспадарчыя работы, дробны рамонт у школах і пашыў школьных вырабаў.

Яна зазначыла, што часовая занятасць моладзі ў Беларусі арганізоўваецца на працягу ўсяго года, але найбольш актыўна моладзь выказвае жаданне працаваць менавіта ўлетку. «Матывацыя на спалучэнне працоўнай дзейнасці і навучання ў моладзі заключаецца не толькі ў дадатковым заробку, але і ў набыцці вопыту першай працы».

Паводле слоў Алёны Дакукінай, сёлета міністэрства падышло да арганізацыі часовай занятасці ў новым фармаце. У маі быў арганізаваны кірмаш вакансій. «Больш за дзве тысячы наймальнікаў адгукнуліся і былі гатовы ўзяць на работу моладзь. Заяўлялася каля 30 тысяч свабодных рабочых месцаў». Яна таксама расказала, што для хлопцаў і дзяўчат, якія не змаглі або не паспелі наведаць кірмаш вакансій, на партале службы занятасці была створана асобная ўкладка, дзе моладзь знаёмілася з вакансіямі. На сёння наймальнікамі з розных куткоў Беларусі заяўлена каля 12 тысяч працоўных месцаў.

Алёна Дакукіна таксама нагадала, што дзеці могуць займацца толькі лёгкімі відамі работ, якія не шкодзяць іх здароўю. У час канікулаў дзеці з 14 да 16 гадоў могуць працаваць 4 гадзіны 36 хвілін у дзень, а ад 16 да 18 гадоў — 7 гадзін. У час вучобы яны таксама маюць магчымасць працягваць працаваць. Так, працоўны дзень падлетка з 14 да 16 гадоў складзе 2 гадзіны 18 хвілін, з 16 да 18 гадоў — 3 гадзіны 30 хвілін.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

ВЫСОКІЯ І ЯКАСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ Ў ЮБІЛЕЙНЫ ГОД

Уласна ў студатрадах у Беларусі працаўладкаваны ўжо больш як 35 тысяч маладых людзей. І гэтая лічба будзе павялічвацца, таму што занятасць круглагадовая. Але асноўнае працаўладкаванне праходзіць у перыяд трэцяга працоўнага семестра, паведаміла **камісар Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Анастасія ЯЛЕНСКАЯ**.

«У гэтым годзе студатрадаўскаму руху спаўняецца 60 гадоў. Гэта для нас вельмі знакавая падзея. Упершыню ў 1963 годзе 2,5 тысячы студэнтаў выехалі ва Уральскую вобласць на сваю першую цаліну, і дагэтуль мы падтрымліваем гэтую традыцыю. Прыемна, што на працягу ўсіх гэтых 60 гадоў студатрадаўскі рух ні на год не спыняўся. І мы гэтым, вядома, вельмі ганарымся».

Камісар нагадала, што ў трэцім працоўным семестры 2023 года рэалізоўваюцца такія працоўныя праекты, як «Атлант», «Трактарабудаўнік» у ААТ «МТЗ», «Аўтазаводзец» у ААТ «МАЗ», «Палессе» ў ААТ «Гомсельмаш», «Медыкус», «Горад маладосці». Традыцыйна студатрады выехалі і за межы краіны. «Самае галоўнае, што студэнцкі атрад — гэта не проста працаўладкаванне. Гэта работа ў камандзе, атрыманне вопыту, вялікая камісарская работа, — адзначыла Анастасія Яленская. — Хочацца адзначыць, што дзякуючы намаганням дзяржавы і асабіста Прэзідэнта Беларусі, Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ, арганізацый, якія прымаюць, мы падыходзім да высокіх і якасных паказчыкаў у гэты юбілейны год».

Якія кірункі работы студатрадаў найбольш запатрабаваны ў моладзі? Па словах Анастасіі Яленскай, традыцыйна на працягу некалькіх гадоў самая вялікая іх колькасць — у сэрвісным кірунку: гэта добраўпарадкаванне тэрыторыі, работа ў сферы аказання паслуг. Далей ідзе сельскагаспадарчы і педагагічны кірунак. Усе астатнія профілі размяркоўваюцца ў роўнай колькасці.

ДЗЕ БАЙЦЫ ШЧЫРАВАЛІ ГЭТЫМ ЛЕТАМ

Намеснік начальніка аператыўнага штаба па арганізацыі работы студэнцкіх атрадаў БДУ Антон КУПЧЫН расказаў, што ў Беларускім дзяржаўным універсітэце вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыі часовай занятасці навучэнцаў. «Ужо не першы год ідзе работа па папулярызацыі студатрадаўскага руху. І прыемна разумець, што гэта работа прыносіць вынік. У 2023 годзе штабам па арганізацыі работы студэнцкіх атрадаў БДУ было арганізавана 69 атрадаў колькасцю 1096 навучэнцаў», — адзначыў ён.

Сёлета студэнты БДУ працавалі ў розных профілях. «Найбольш папулярнымі з'яўляюцца сэрвісныя: афіцыянты, работнікі кол-цэнтраў, абслуговы персанал. На другім месцы педагагічныя атрады — выхавальнікі ў аздараўленчых лагерах. Далей — вытворчыя атрады (работа ў цэхах вядучых прадпрыемстваў нашай краіны). І з імі на ўзроўні сельскагаспадарчыя атрады: праполка раслін, уборка ўраджаю».

Сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ БНТУ Аляксей БАЛЫШ паведаміў, што ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце было створана 37 студатрадаў агульнай колькасцю больш як 1,5 тысячы чалавек. «У гэтым годзе нашы студэнты ў складзе студэнцкага атрада прынялі ўдзел у Рэспубліканскім працоўным праекце «Аўтазаводзец-2023», працавалі на будоўлі функцыянальнага комплексу на скрыжаванні вуліцы Кірылы Тураўскага і праспекта Незалежнасці, будавалі гандлёвы цэнтр», — сказаў ён.

Дар'я ЛУКАШЭВІЧ, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ БДПУ імя М. Танка, адзначыла, што ў сувязі са спецыфікай ва ўніверсітэце найбольш папулярныя педагагічныя атрады. «Так, нашы педагагічныя атрады працуюць у найлепшых установах адукацыі. Атрад «Сузор'е» — у Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Зубраня».

Паводле яе слоў, у ВНУ таксама ёсць вытворчыя атрады, якія працавалі на заводзе электронікі і бытавой тэхнікі «Гарызонт». Сэрвісныя атрады прыводзілі ў парадак інтэрнаты. А таксама сёлета Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт арганізаваў сэрвісны атрад на базе мемарыяльнага комплексу «Хатынь», дзе студэнты гістарычнага факультэта працавалі экскурсаводамі.

Сакратар першаснай арганізацыі БРСМ Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Ірына ШАЛЫГІНА падкрэсліла, што ва ўніверсітэце займаюцца не толькі ўладкаваннем у студатрады, але таксама індывідуальным працаўладкаваннем. «У гэтым годзе ў нас працуе 24 атрады колькасцю 370 чалавек. Наш будаўнічы атрад «Тытан» выехаў у Воронеж, дзе працаваў на будаўніцтве школы. Акрамя таго, кожны год мы шчыруем у рамках рэспубліканскіх працоўных праектаў — гэта «Атлант», «Аўтазаводзец», «Трактарабудаўнік».

ВАЖНЫ ЭЛЕМЕНТ ДАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ — БЯСПЕКА

Як моладзь забяспечваюць бяспечнымі працоўнымі месцамі, расцлумачыў **дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандр СЕМІЧ**. Ён адзначыў, што першы вопыт работы павінен быць станоўчы.

«Важны элемент дастойнай працы — бяспека. Работа па гарантаванні бяспекі аб'ектаў, на якіх будуць працаваць будатрады, пачынаецца зімой, калі на сайтах мясцовых выканаўчых распарадчых органаў з'яўляецца інфармацыя аб арганізацыях, што плануюць прыняць студэнцкія атрады», — сказаў дырэктар Дэпартамента.

Паводле яго слоў, у 2019 годзе паміж Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Федэрацыяй прафсаюзаў было падпісана пагадненне па пытаннях стварэння бяспечных і здаровых умоў працы і прафілактыкі вытворчага траўматызму, у якім прапісана гарантаванне бяспекі тых аб'ектаў, дзе будуць працаваць студэнцкія атрады.

«Умоўна арганізацыі дзеляцца папалам паміж міністэрствам і прафсаюзамі, і да пачатку лета ўсе яны павінны быць абследаваны або дзяржаўнай інспекцыяй працы, або тэхнічнай інспекцыяй працы прафсаюзаў», — распавёў Аляксандр Семіч. Наступны этап — накіраванне Дэпартаментам інфармацыйнага ліста ўсім зацікаўленым. «У ім расказваецца, як правільна арганізаваць працу менавіта з улікам работы з моладдзю. Бо многія з хлопцаў і дзяўчат яшчэ непаўналетнія, што накладвае абмежаванні як па відах выкананых работ, так і па іх працягласці.

Пасля на працягу лета Дэпартамент сумесна з прафсаюзамі імкнецца мінімум па адным разе наведаць усе аб'екты, на якіх працуюць студэнты. «У асноўным мы выяўляем такія парушэнні: прыцягненне моладзі да работ, бяспечнаму выкананню якіх яны не навучаны, і незабеспячэнне работнікаў сродкамі індывідуальнай абароны або непрымяненне гэтых сродкаў. Большасць такіх парушэнняў устараняецца яшчэ непасрэдна ў ходзе рэйду мабільнай групы або правядзення маніторынгу».

Трэці працоўны

«ПАЛЕССЕ-2024» ЧАКАЕ СТУДЭНТАЎ З РАСІІ

Такімі планамі падзяліўся з журналістамі другі сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ на закрыцці рэспубліканскага міжпрофільнага працоўнага праекта студатрадаў у Гомелі.

Падчас яго праходжання — у ліпені-жніўні — дзясяткі байцоў вытворчых, будаўнічых і сэрвісных студатрадаў працавалі на розных аб'ектах холдынгу «Гомсельмаш». Хлопцы і дзяўчаты з Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей праявілі сябе ў цэхах, на сацыяльных аб'ектах, а таксама будаўнічых пляцоўках на тэрыторыі прадпрыемства.

Аляксандр Прохараў нагадаў, што ў мінулым годзе быў рэалізаваны пілотны праект на «Гомсельмашы». І ў 2023-м выйшлі на новы ўзровень, які надалей будзе толькі развівацца. «Ужо дасягнуты дамоўленасці на ўзроўні Міністэрства прамысловасці прадоўжыць гэтую работу, пашырыць геаграфію ўдзельнікаў. На прадпрыемстве гатовы да супрацоўніцтва, падтрымліваюць моладзь і студатрадаўскі рух. Больш за тое, ёсць зацікаўленасць з боку расійскіх калег на наступны год. Чакаем, што і па лініі Саюзнай дзяржавы таксама далучацца расійскія студатрады», — падкрэсліў ён.

Рэспубліканскі міжпрофільны працоўны праект студэнцкіх атрадаў «Палессе» прызнаны паспяховым. На працягу амаль двух месяцаў хлопцы і дзяўчаты са студатрадаў былі заняты на вытворчасці беларускіх камбайнаў, яны паглыбляліся ў працоўныя і іншыя прафесіі. Неўзабаве стартуе падрыхтоўка да новага працоўнага сезона «Палессе-2024».

Фота БелТА.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

Вехі гісторыі

ПРЫГАДАЕМ, СЯБРЫ, КАМСАМОЛЬСКІЯ ГАДЫ

У мэтах падрыхтоўкі і правядзення ў кастрычніку ў Мінску ў Палацы Рэспублікі культурнага мерапрыемства, прысвечанага святкаванню 105-годдзя Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі, Міністэрства культуры аб'яўляе конкурсны адбор рэжысёрскіх канцэпцый названага мерапрыемства.

Фота з сайта БРСМ.

Да ўдзелу ў адборы запрашаюцца рэжысёры-пастаноўшчыкі тэатральна-відовішчных арганізацый і арганізацый культуры, студэнты і навучэнцы ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, якія вучацца па спецыяльнасцях «Рэжысура тэатра», «Рэжысура свят», «Мастацтва эстрады (рэжысура)» і роднасных спецыяльнасцях. Таксама запрашаюцца іншыя асобы, якія маюць вопыт правядзення культурных мерапрыемстваў і зацікаўлены ў рэалізацыі сваіх творчых ідэй у рамках правядзення найбуйнейшых фестывальных праектаў (святаў) Еўропы.

Рэкамендацыі ЦК ГА «БРСМ» па падрыхтоўцы рэжысёрскіх канцэпцый наступныя. Блок «Зараджэнне УЛКСМ, 1918 год» — гістарычная хроніка, якая транслюецца праз відэафрагменты тых гадоў у масавым харэаграфічным нумары. Прывітанне вядучых канцэрта, масавае выкананне гімна Рэспублікі Беларусь. Затым ідзе блок «Віншавальныя і прывітальныя адрасы».

У блоку «Уздым краіны сіламі УЛКСМ 1918—1941» трэба паказаць праз сродкі мастацкай выразнасці, як СССР развіваўся праз дзейнасць членаў УЛКСМ. Наступны блок «Вайна 1941—1945» прысвечаны подзвігам камсамольцаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Блок «Студатрадаўскі рух ва УЛКСМ і адраджэнне краіны пасля вайны» прызваны расказаць пра аб'екты і студэнцкія атрады, якія працавалі на будоўлях пасля вайны.

Нарэшце — «Сучасны БРСМ». У гэтым блоку трэба распавесці пра аб'яднанне двух самых магутных маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў краіны (Беларускі саюз моладзі і Беларускі патрыятычны саюз моладзі) і фарміраванне Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі як галоўнага пераемніка Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі. Праз сродкі мастацкай выразнасці трэба паказаць, чым ганарыцца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, у тым ліку расказаць аб дзейнасці Саюза моладзі (патрыятычны напрамак, валанцёрскі рух, студатрадаўскі рух, праектная дзейнасць для адоранай і таленавітай моладзі атрадаў). А таксама расказаць пра герояў сярод моладзі ў сучаснай суверэннай Беларусі.

У рэжысёрскай канцэпцыі неабходна раскрыць тэму пераемнасці пакаленняў як найважнейшую з задач сучасных камсамольцаў (членаў ГА «БРСМ»). Расказаць аб актыўным узаемадзеянні Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі і Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Матэрыялы трэба прадставіць у тэрмін да 10 верасня ў электронным выглядзе на электронныя адрасы: ministerstvo@kultura.by, 03-8@kultura.by.

Крок да прафесіі

Выбіраючы стальную магістраль

З пачатку навучальнага года ў школах Беларусі адкрылася яшчэ шэсць транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці. З 1 верасня яны пачалі сваю работу ў сярэдніх школах № 17 Віцебска, № 5 Гомеля, № 37 Брэста, № 186 Мінска, № 7 Жлобіна і № 4 Калінкавіч.

Школьнікі транспартных класаў будуць знаёміцца з асаблівасцямі прафесіі чыгуначніка. У праграме навучання прадугледжаны экскурсіі на прадпрыемствы Беларускай чыгункі, дзе дзеці ўжывую змогуць убачыць усё тое, пра што ім будуць расказваць на занятках педагогі.

Асноўная мэта транспартных класаў — папулярызацыя чыгуначных прафесій і стварэнне ўмоў для іх усвядомленага выбару навучэнцамі. Дзеці, якія паспяхова скончаць транспартныя класы, змогуць атрымаць мэтавае накіраванне для паступлення ва ўстановы адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў для работы на Беларускай чыгунцы.

Усяго ў 2022/2023 навучальным годзе ў краіне функцыянавала дзевяць транспартных класаў, у якіх праходзілі навучанне больш за 200 вучняў сярэдніх школ у Баранавічах, Лунінцы, Лідзе, Магілёве і Гомелі, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

З удзелам Беларускай чыгункі для транспартных класаў распрацавана праграма аб'яднання па інтарэсах «На шляху да прафесіі: асновы чыгуначнага транспарту» для навучэнцаў 8–9 класаў і вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Увядзенне ў прафесію чыгуначнага транспарту» для навучэнцаў 10–11 класаў.

Праграмы арыентаваны на дадатковую падрыхтоўку школьнікаў для атрымання асноўнай адукацыі па спецыяльнасцях чыгуначнай накіраванасці.

У рэалізацыі і метадычным суправаджэнні гэтых праграм будуць удзельнічаць арганізацыі Беларускай чыгункі, Дарожны цэнтр па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» і вядучыя прафільныя ўстановы адукацыі: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту і яго філіялы (Брэсцкі, Аршанскі і Гомельскі каледжы), а таксама Мінскі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту імя Я. П. Юшкевіча.

Рука дапамогі

ДЗЕЛЯ АДАПТАЦЫІ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Рэспубліканскі студэнцкі праект «Штаб першакурсніка» стартаваў пад эгідай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ва ўстановах вышэйшай адукацыі краіны ў Дзень ведаў.

Фота з сайта БРСМ.

Праект плануецца рэалізоўваць штогод у першым семестры новага навучальнага года з мэтай адаптацыі студэнтаў-першакурснікаў у новых калектывах, стварэння ўмоў для ўключэння ў грамадскае жыццё ВНУ і развіцця лідарскіх якасцяў хлопцаў і дзяўчат.

Штодня ў «Штабах першакурсніка» студэнты старэйшых курсаў, актывісты БРСМ будуць дапамагаць першакурснікам аператыўна вырашаць узніклыя ў іх праблемныя пытанні — ад сацыялізацыі і пошуку аднадумцаў да работы ў адзінай каманде. Акрамя таго, задачай штабоў з'яўляецца інфармацыйная работа па папулярызацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў студэнцкіх аўдыторыях і інтэрнатах.

Камертон настрою

«Прэс-код» у новым фармаце

Другі сезон нашумелага рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» пройдзе ў новым фармаце. Цяпер удзельнікі будуць вочна сустракацца з членамі журы і абараняць сваю аўтарскую працу.

Нагадаем, старт прыёму заявак на ўдзел у другім сезоне рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» быў дадзены 15 лістапада на палях рэспубліканскага медыя-форуму PROdigital у рамках Дня моладзі на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Конкурс, арганізатарамі якога выступаюць Міністэрства інфармацыі і ЦК БРСМ пры падтрымцы Мінадукацыі, праводзіцца з мэтай рэалізацыі задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і садзейнічання станаўленню прафесійных маладых журналістаў сродкаў масавай інфармацыі.

Ён пройдзе па наступных намінацыях у дзвюх узроставых катэгорыях (ад 16 да 21 года ўключна і ад 22 да 31 года ўключна): «Найлепшыя аўтарскія матэрыялы» (рэпартаж, спецыяльны праект патрыятычнай тэматыкі); «Найлепшая карыкатура па найбольш вострай сацыяльнай тэматыцы»; «Найлепшы фотарэпартаж»; (катэгорыя друкаваных СМІ) і «Найлепшы відэасюжэт пра памятныя мясціны Беларусі, вядомых людзей, знамянальную падзею»; «Найлепшы відэаблог»; «Найлепшая аператарская работа»; «Найлепшы праект у новых медыя» (катэгорыя электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў).

Конкурс праходзіць у два этапы: абласныя (Мінскі гарадскі) — з 1 верасня да 1 кастрычніка, рэспубліканскі — да 25 лістапада.

Лакацыі актыўнасці

СЮРПРЫЗ-НАПАМІН АБ ПЕРШЫХ ВЫБАРАХ

Упершыню маладыя выбаршчыкі, якія галасуюць, у адзіны дзень галасавання атрымаюць на выбарчых участках сувеніры ад ЦВК Беларусі. Такая навіна апублікавана ў афіцыйным тэлеграм-канале Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь. Пра гэта са спасылкай на яго інфармуе сайт БРСМ.

Паведамляецца, што сакрэту ніякага няма, але сюрпрызы любяць цішыню. «Што гэта будзе за сувенір, пакуль нікому не скажам і не пакажам», — гаворыцца ў інфармацыі.

Дарэчы, да грамадзян, якія ўпершыню галасуюць, будуць адносіцца грамадзяне, якія дасягнулі/дасягнуць узросту 18 гадоў у перыяд з 28 лютага 2022 года да 25 лютага 2024 года ўключна.

Цэнтрвыбаркамам устаноўлена сярэдняя колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання.

Колькасць выбаршчыкаў у выбарчай акрузе вызначаецца з ліку грамадзян, якія маюць выбарчае права, якія пражывалі на тэрыторыі, што ўваходзіць у выбарчую акругу, пры правядзенні апошніх выбараў або рэферэндуму.

Пры правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму ў 2022 годзе ў спісы грамадзян Беларусі, якія маюць выбарчае права, было ўключана 6 815 635 грамадзян.

Для правядзення выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў на тэрыторыі Беларусі ўтвараецца 110 выбарчых акруг.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Аляксандр БУРДА:

«КОЖНЫ МАЛАДЫ АБ СВАЁЙ ЧАЛАВЕК САМ ПАВІНЕН ДУМАЦЬ БУДУЧЫНІ»

У 27 гадоў ён адказвае за ідэалагічнае і кадравае забеспячэнне прадпрыемства з калектывам у больш як 3,3 тысячы чалавек, карыстаецца павагай сярод падначаленых і з'яўляецца арыенцірам для калег. Аляксандр Бурда — начальнік упраўлення развіцця персаналу РУП «Белмытсэрвіс». У найбуйнейшую лагістычную кампанію краіны ён трапіў тры гады таму і прайшоў шлях ад вядучага спецыяліста да начальніка ўпраўлення. У чым сакрэт кар'ернага поспеху, пацікавіліся ў маладога кіраўніка карэспандэнты.

ПРА СЯМ'Ю, АРМІЮ І ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

— Аляксандр, кажуць, што задаткі лідара фарміруюцца ў дзяцінстве. У якой сям'і нарадзіўся будучы кіраўнік?

— У звычайнай вясковай, якая з Брэсцкай вобласці пераехала ў Барысаў. Бацька працуе ў лясной галіне, маці — урач у ваенным шпіталі. Сястра пайшла па матчыным шляху: яна стаматолаг. У Барысаве я скончыў сярэднюю школу № 16 імя Івана Барысюка. Вельмі ўдзячны настаўнікам, бо менавіта тыя веды і навыкі, якія ў далейшым развівалія падчас вучобы ва ўніверсітэце і ў рабоце, — у мяне са школьнага парога. Пачынаючы з чацвёртага класа вёў выпускныя вечары. Быў піянерам, пасля ўступіў у шэрагі БРСМ. Усе грамадскія ініцыятывы ніколі не праходзілі міма мяне. Усё гэта паспяхова сумяшчалася з вучобай і са спортам. Пэўных поспехаў дасягнуў у спартыўна-бальных танцах, перамагаў на абласных спаборніцтвах. Аднак у адзін момант мне падалося, што сапраўды мужчына павінен займацца нечым больш сур'ёзным — так я стаў гуляць у футбол. Пачынаў на прафесійным узроўні, цяпер займаюся больш для сябе: з'яўляюся капітанам футбольнай каманды «Белмытсэрвіс».

— Калі прыйшоў час вызначацца з прафесіяй, якой дзейнасцю хацелі займацца? І ці спрадзіліся ў выніку вашы спадзяванні?

— У Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ішоў мэтанакіравана. У мяне заўсёды было вялікае жаданне служыць дзяржаве і грамадству. Разумеў, што неабходныя веды і навыкі для далейшай работы я магу атрымаць у Акадэміі кіравання. Працэс паступлення быў дастаткова сур'ёзны. Падрыхтоўку да паступлення пачаў яшчэ ў 10 класе, у выніку трапіў на бюджэт. Вучыўся па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка».

— Служыць беларускаму народу можна і ў арміі, органах унутраных спраў... Не даводзілася ў якасці прафесійнай дзейнасці разглядаць сілавыя структуры?

— У арміі служыў, з'яўляюся лейтэнантам запасу. Больш за тое, я хацеў трапіць у армію. Мог быць камісаваны па стане здароўя, але прайшоў дадатковае абследаванне і атрымаў дазвол на службу. Гатовы стаць на абарону Радзімы ў любы момант.

— Некаторыя робяць наадварот: прыпісваюць сабе хваробы, якіх насамрэч не існуе. У сучаснага пакалення сфарміравалася неадназначнае стаўленне да вайсковай павіннасці. Якія задачы знаходзяцца ў зоне вашай адказнасці?

— Яно празрыстае. Дастаткова паглядзець на паўднёвую мяжу нашай краіны. Не дай бог, якая-небудзь непрадбачаная сітуацыя — каму мы потым будзем тлумачыць пра кантрактную армію? Мужчына, калі ён здаровы, прыдатны для службы ва Узброеных Сілах, абавязаны адслужыць. Будзе гэта ваенная кафедра пры ўніверсітэце, служба ў рэзерве або тэрміновая ваенная служба — прайсці праз гэта трэба адназначна. Армія — гэта сур'ёзная школа, якая дала мне вельмі многае. Больш за тое, армія дысцыплінуе. У маім узводзе служылі дастаткова дарослыя хлопцы, усе — з вышэйшай адукацыяй. Канешне, узровень адказнасці многаму вучыць: памыляецца адзін, адказваюць усе. Таму і з гэтага пункту гледжання такая школа патрэбная. Скажу шчыра, была думка застацца ў арміі, аднак жыццё склалася па-іншаму.

— Падчас навучання ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь вы ўзначальвалі камітэт першічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Наколькі складана было сумяшчаць вучобу з грамадскай дзейнасцю?

— Ён пачаў займацца на другім курсе, на трэцім узначаліў першічную арганізацыю БРСМ. Паралельна сумяшчаў работу журналістам у прэс-цэнтры, які займаўся асвятленнем дзейнасці навучальнай установы, і, па мерках студэнта, меў нядрэнны заробак. Маім кіраўніком, а таксама першым настаўнікам у журналісцкай дзейнасці была цяперашні прэс-сакратар прэм'ер-міністра Аляксандра Ісаева. Мы выпускалі газету «Зеркало», стваралі кантэнт для сайта Акадэміі кіравання, вялі сацыяльныя медыя ВНУ. Сумяшчаць гэта з вучобай і работай у БРСМ было нескладана. У многіх студэнтаў існуе меркаванне, што, калі яны вучацца на адны «дзясяткі» і «дзясяткі», гэтага дастаткова для працаўладкавання. Гэта не зусім так. Для таго, каб цябе заўважылі, трэба прыкладаць шмат намаганняў, у тым ліку ўдзельнічаць у грамадскай, навуковай дзейнасці. Кожны малады чалавек сам павінен думаць аб сваёй будучыні (пажадана з першага курса), а не чакаць, што нехта падумае пра гэта за яго. Часу на раскачку няма, асабліва цяпер. Вельмі канкурэнтаздольны рынак, шмат высокакваліфікаваных кадраў, і, вядома, работадаўца будзе выбіраць з плеяды маладых выпускнікоў тых, у каго ўжо ёсць пэўны вопыт работы.

— Сёння Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі актыўна развіваецца, рэалізуўвае грамадска значныя праекты, удзельнічае ў найважнейшых ініцыятывах. Як лічыце, ці патрэбна кожнаму юнаму беларусу ўступаць у маладзёжную арганізацыю?

— Абсалютна перакананы, што патрэбна. Супрацоўнікі нашага прадпрыемства ўцягнуты ў грамадска-палітычнае жыццё краіны. Сёлета мы стварылі галіновы камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Маладыя людзі да 31 года ў стапрацэнтным складзе ўступілі ў БРСМ. Калі вярнуцца да вытокаў, БРСМ — правапераемнік камсамола. Беларусь — адна з нямногіх краін, якая на такім высокім узроўні захавала пераемнасць пакаленняў. А да піянераў яшчэ ёсць акцябраты — самыя маленькія нашы школьнікі. Пераемнасць пакаленняў у гэтым пытанні павінна быць. Традыцыі ж не толькі ў тым, каб навязаць піянерам гальштук або павесіць значок члена БРСМ. Гэта і дапамога дзецям-сіротам, і пажылым людзям, і валанцёрскі рух, і патрыятычнае выхаванне. Усё гэта з'яўляецца асновай для станаўлення беларускага грамадзяніна, планамернага яго ўваходу ў грамадска-палітычнае жыццё нашай краіны. 2020 год паказаў, што без гэтага ніяк. І, магчыма, тады дзеці адносіліся да БРСМ не зусім сур'ёзна, некаторым здавалася, што іх прымушаюць уступаць у маладзёжную арганізацыю, то цяпер падрастаючае пакаленне па-іншаму ўспрымае сваё ўступленне, разумее, для чаго гэта трэба. Самае важнае — БРСМ з'яўляецца той маладзёжнай арганізацыяй, якая вялікую ўвагу ўдзяляе патрыятычнаму выхаванню моладзі, сваімі праектамі не дае ўсумнівацца ў нашай гісторыі. Асабліва гэта датычыцца перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць асобныя недружалюбныя нам краіны, якія дагэтуль спрабуюць перапісаць гісторыю, робяць герояў з тых, хто забіваў нашых прадзедаў і дзядоў.

ПРА КАЛЕКТЫЎНУЮ АДКАЗНАСЦЬ І КАДРЫ

— Колькі чалавек знаходзіцца пад вашым непасрэдным падначаленнем?

— Калі ўлічваць цэнтральны апарат упраўлення і яго філіялы ў рэгіёнах, то амаль восемдзесят.

— Аднак у цэлым вы адказваеце за кадравае забеспячэнне прадпрыемства, а гэта больш як 3,3 тысячы чалавек... Якія задачы знаходзяцца ў зоне вашай адказнасці?

— Работа ў гэтым кірунку не зводзіцца толькі да таго, каб адпускаць супрацоўніка ў адпачынак або рыхтаваць загад аб яго працаўладкаванні. Гэта яшчэ і ідэалагічная работа, штодзённае ўзаемадзеянне з чалавекам. Пачынаючы з таго, з усмешкай або з сумам ён прыйшоў на работу, і заканчваючы тым, з якім настроем ён пойдзе дахаты. Гэтае пытанне глабальнае і комплекснае.

— Мяркую, што вы кіруеце людзьмі, якія старэйшыя за вас. Ці не ўзнікае складанасцяў з-за ўзроставай розніцы?

— Сапраўды, ва ўпраўленні практычна ўсе супрацоўнікі старэйшыя за мяне. Ніякіх складанасцяў або непаразуменняў у нас няма. Напэўна, гэта звязана з тым, што імкнуся быць шчырым, тактоўным і ветлівым у адносінах да людзей. Унікаю ў сацыяльна-побытавыя ўмовы супрацоўнікаў, ведаю іх статус, колькі дзяцей выхоўваецца ў сем'ях, нават дні нараджэння. Гэта калі казаць пра асабістыя адносіны. А прафесійнае будуецца на асабістым. Калі людзі бачаць, што ты да іх добра ставішся, стаіш за іх гарой, то яны будуць адказваць табе тым жа. І, вядома, работадаўца будзе выбіраць з плеяды маладых адносіны ў сваёй рабоце людзі аддаюцца на ўсе 100 працэнтаў, а для кіраўніка гэта самае важнае.

— У чым прычына поспеху такога імклівага кар'ернага росту?

— Складана адказаць на гэтае пытанне, але паспрабую. Магчыма, на гэта паўплывала маё выхаванне, характар. Імкнуся дасягаць поспеху ў любых пачынаннях, ніколі не спыняюся, калі ёсць пэўныя бар'еры і перашкоды. Люблю людзей, яны мне адказваюць тым жа: верай, падтрымкай, клопатам і адносінамі да справы.

Падчас гутаркі ў кабінеце майго суразмоўцы загучала музычная кампазіцыя. Як высветлілася, гімн РУП «Белмытсэрвіс». Гэта азначае, што на прадпрыемстве пачаўся абедзенны перапынак. Дынамікі ўсталяваны ў кожным кабінеце, таму пра адпачынак падчас працоўнага дня ведаюць усе.

— Аляксандр, чыя ідэя?

— Генеральнага дырэктара прадпрыемства. Тэкст гімна перапісвалі тройчы. З трэцяй спробы трапілі: хацелі, каб кожнае слова кранала сэрца. А вось працоўны дзень на прадпрыемстве пачынаецца з гучання Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Такую палітыку мы прынялі яшчэ ў 2019 годзе. Таму да падзей, якія адбыліся ў 2020 годзе, мы ўжо падышлі максімальна падрыхтаванымі, у тым ліку дзякуючы гэтаму рашэнню. У выніку на прадпрыемстве з калектывам у 3,3 тысячы чалавек, з аб'ектамі інфраструктуры па ўсёй краіне, у нас не было ні аднаго факта несанкцыянаваных мерапрыемстваў. За тры хвіліны да заканчэння абедзеннага перапынку гучыць спартыўная песня — нефармальная кампазіцыя пра нашы спартыўныя дасягненні. Людзі прызвычаіліся. Яны ўжо не ўяўляюць пачатак працоўнага дня без Дзяржаўнага гімна, як і абедзеннага перапынак — без афіцыйнага гімна «Белмытсэрвіс».

— Наколькі такія карпаратыўныя элементы эфектыўныя?

— Патрыятызм у сыракім сэнсе гэтага слова нараджаецца на аснове лакальнага патрыятызму. Любоў да сваёй сям'і, прадпрыемства, малой радзімы, у цэлым да краіны — усё ўзаемазвязана. Афіцыйны гімн прадпрыемства таксама з'яўляецца элементам лакальнага патрыятызму. Лічу, што кожны чалавек павінен палюбіць сваё месца працы. Пазіцыі, калі ў РУП «Белмытсэрвіс» людзі прыходзілі з задальненнем, заўсёды прытрымліваецца і наш генеральны дырэктар. І дзеля гэтага робіцца многае. Супрацоўнікі прыходзяць у калектыў з добрым настроем, ведаюць, што іх падтрымаюць у той ці іншай сацыяльнай сітуацыі. На прадпрыемстве дастаткова сур'ёзны сацыяльны пакет. Гэта выплаты да святочных дат (напрыклад, да Дня Незалежнасці), санаторна-курортнае лячэнне супрацоўнікаў, аздараўленне дзяцей за кошт прадпрыемства, матэрыяльная дапамога і іншае. У нас кожны супрацоўнік, а таксама члены іх сем'яў застрахаваныя. Тых, хто хварэў на COVID, мы за кошт прадпрыемства адпраўлялі на аздараўленне ў санаторыі.

— Вы знаёміцеся з кожным, хто ўладкоўваецца на прадпрыемства?

— Вядома. Арганізоўваю сумоўе з кіраўніком, знаёмлю з калегамі. Калі чалавек уладкоўваецца на працу, мая задача — стварыць умовы для таго, каб ён прыносіў сваёй дзейнасцю максімальную карысць прадпрыемству, не адцягваўся на побытавыя рэчы і з першых дзён быў пагружаны ў працоўны працэс.

— Ці шмат на прадпрыемстве моладзі?

— Сёння паказчык моладзі на прадпрыемстве вышэйшы, чым у сярэднім па краіне. 21 працэнт супрацоўнікаў — людзі ва ўзросце да 31 года, а ў цэнтральным апараце лічба яшчэ больш высокая — 25 працэнтаў. Гэта значыць, што чацвёртая частка супрацоўнікаў цэнтральнага апарату (а пад цэнтральным апаратам мы маем на ўвазе цэнтр кампетэнцый усяго прадпрыемства) — людзі да 31 года. Наш генеральны дырэктар ніколі не глядзіць на ўзрост, а перш за ўсё ацэньвае кампетэнцыі і бачыць тое, што можа вырасці з таго ці іншага маладога спецыяліста. Потым гэтых маладых людзей суправаджаем, у нас ёсць перспектыўны кадравы рэзерв. Сістэма навучання за кошт сродкаў прадпрыемства, далейшае ўдасканаленне (курсы, магістратура і інш.) — усе дарогі адкрыты.

— Было б добра, каб наша інтэрв'ю пачыталі тыя маладыя людзі, якія думаюць, што дасягнуць поспеху ў прафесійнай дзейнасці ў нашай краіне немагчыма...

— Той, хто так думае, абсалютна не мае рацыі. Па-першае, у краіне створаны ўсе магчымасці. Любы малады чалавек можа пабудаваць уласную кар'еру. Прычым зрабіць гэта самастойна. Неабходны намаганні і веды — аснова любой складнікі поспеху. Немалаважнае значэнне мае і імкненне чагосьці дасягнуць, чаму-небудзь навучыцца, а не сядзець без справы і чакаць, пакуль нехта прыйдзе і пакліча цябе на работу з вялікім заробкам. Такога не будзе. Але тое, што ў краіне створаны ўсе ўмовы для паспяховага жыцця, — адназначна. І наша прадпрыемства з'яўляецца гэтаму яркім прыкладам.

ПРА МАЛАДЗЁЖНЫ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМ, БАЦЬКОЎСТВА І ТРАДЫЦЫЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

— Вы з'яўляліся членам Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі першага скліканння, першым намеснікам старшыні Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Як трапілі і якія задачы вырашалі?

— У Маладзёжны парламент быў дэлегаваны ад Мінска і займаўся патрыятычнымі праектамі. Паралельна працуючы ў Маладзёжнай палаце, адказваў за валанцёрства, эканоміку, патрыятычнае выхаванне моладзі. У прыватнасці, курыраваў алічбоўку помнікаў: мы ездзілі па ўсёй краіне і займаліся ўстаноўкай таблічак з QR-кодам, прычым не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Цяпер праект «Лічбавая зорка» праводзіцца пад эгідай БРСМ. У рамках дзейнасці ў Маладзёжнай палаце даводзілася прымаць удзел у работах па рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Сімвалічна, што ўжо будучы супрацоўнікам «Белмытсэрвіс» разам з калегамі на лагойскіх могілках мы добраўпарадкавалі пахаванне Іосіфа Камінскага — адзінага дарослага жыхара Хатыні, які выжыў.

— Ці спатрэбіўся вопыт маладзёжнага парламентарызму?

— Безумоўна. Маладзёжны парламентарызм вучыць паглыбляцца ў працэсы, якія адбываюцца, не быць дылетантам падчас выступлення перад аўдыторыяй.

— Ведаю, што вы працуеце над дысертацыяй. Як знаходзіце час яшчэ і на навуковую дзейнасць?

— Хачу развівацца ва ўсіх кірунках. З'яўляюся маладым бацькам, таму сумяшчаць усё няпроста. Аднак у сутках — 24 гадзіны, таму вольную хвіліну знаходжу. Менш часу застаецца на сон.

— Віншуем вас з папаўненнем у сям'і! Некаторыя маладыя людзі, якія будуюць кар'еру, увогуле аб дзецях не задумваюцца...

— Больш шчаслівага статусу, чым бацька, у свеце не існуе. У мяне дачка, яе завуць Міраслава. Найлепшага імгнення, чым тое, калі ў першы раз узяў яе на рукі пры выпісцы з радзільнага дома, не адчуваў ніколі. Дзеці — гэта самае святое, дарагое, што можа быць. З іх з'яўленнем жыццё мяняецца кардынальна. Ты ўжо жывеш не для сябе. Усё робіш для таго, каб твайму дзіцяці было добра. Бацькоўства максімальна дысцыплінуе. Адназначна ўсім дзяўчатам трэба імкнуцца цяжарыць і нараджаць, хлопцам — станавіцца бацькамі і выхоўваць будучае пакаленне патрыётаў-беларусаў.

— А вось у некаторых «цывілізаваных» краінах так не лічаць. На тым жа Захадзе набірае папулярнасць субкультура «чайлдфры», калі людзі свядома не нараджаюць дзяцей...

— Яны ж не толькі гэта прапагандуюць. У іх і ЛГБТ — гэта нармальна, што для нас дзікунства, і адналюбія шлюбы... Беларусам з гэтымі каштоўнасцямі не па адной дарозе ад слова «зусім». Мы адмаўляем еўрапейскія каштоўнасці, для нас гэта нават не тэма для размовы. Вядома, ёсць пэўная катэгорыя людзей, але мы не маем права іх асуджаць, гэта іх выбар. Але выступаем выключна супраць прапаганды тых еўрапейскіх каштоўнасцяў, якія нам спрабуюць навязаць. Не атрымаецца. Самае галоўнае, што іх не ўспрымае наш народ.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Аўдыявэрсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства 22 сентября 2023 года в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование объекта	Орган принудительного исполнения	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Наименование подразделения Департамента **– Жлобинский межрайонный отдел управления по Гомельской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь**				
1	**Земельный участок с кадастровым номером 321882803601000011**, **площадью 0,2500 га (право собственности)**, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, д. Зеленый Кряж, ул. Зеленая, 3. **Ограничения (обременения): запрет совершения регистрационных действий судебного исполнителя**	ОПИ Жлобинского р-на	**1 464,30**	146,43

Шаг аукциона – 5 %.

Участник торгов обязан до начала торгов осмотреть предмет торгов. Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность всем организациям и физическим лицам предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»): р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах № 1, проводимых 22 сентября 2023 г. (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка, с отметкой банка можно **с 07 сентября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 20 сентября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Лот может быть снят Организатором по письменному заявлению Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь до объявления его проданным. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов** (далее – Претендент на покупку), не позднее **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее **20 (двадцати) рабочих дней** со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по оплате предмета торгов.

Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства» (Указ Президента РБ от 19.02.2016 г. № 63 в редакции Указа Президента РБ от 07.03.2023 г. № 60).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»
извещает о проведении электронных торгов **№ 2023.Г.002.00084**
по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY,
по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: Дочернее республиканское унитарное предприятие «ГосСтрой-Инжиниринг», тел. +375 (2151) 6-16-36.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 09.10.2023 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-175427 площадью 137,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 25-159, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение.

Обременение: договоры аренды: № 1 от 03.04.2017 сроком действия до 31.12.2023, № 3 от 03.04.2017 сроком действия до 31.12.2023.

Нач. цена: 166 781,67 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 16 678,16 бел. руб.

Извещение о проведении аукциона опубликовано 06.09.2023 на официальном сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by (№ 18403), на сайте Витебского облисполкома https://vitebskregion.gov.by/ru/Aukciony-ru

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Дата и место торгов – 20.09.2023 в 11.00, г. Минск, ул. Б. Берута, д. 3Б, оф. 213.

Продавец – ООО «Пицари Ленд», УНП 192679441.

Организатор торгов – ликвидатор Общества – ИП Рудяк Александр Олегович (тел. 8029-119-86-66);

Предмет торгов:

Лот 1 – хозяйственно-бытовые товары, в ассортименте 18 позиций.

Лот 2 – материалы и инструменты для ремонта и строительства, в ассортименте 29 позиций.

Лот 3 – гранулят, в ассортименте 4 позиции (списки размещены на сайте банкротство.бел).

Начальная цена:

Лот 1 – 1 109,70 рубля. Лот 2 – 2 505,95 рубля. Лот 3 – 2 943,04 рубля.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены.

Размер задатка: 10 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на р/с – ООО «Пицари Ленд», УНП 192679441: BY21REDJ30121003706200100933 в ЗАО «РРБ-Банк», код банка REDJBY22 до 18.09.2023.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220092, г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 213 до 18.00 18.09.2023 г.

Требования к участникам, порядок проведения торгов и возмещение затрат по их организации – в соотв. с постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16.

Срок подписания договора, возмещения затрат – в течение 15 дней со дня проведения торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **10 октября 2023 года** проводит **открытый аукцион № 6-АЧ по продаже права заключения договора аренды** недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Коэффициент к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Целевое использование имущества	Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения
Арендодатель – ОАО «ГУМ», тел. +37517 343 10 92						
1	г. Минск, пр-т Независимости, 21, 21/1	126,7	3,0; 0,5 – на период проведения ремонта арендуемого помещения и (или) отсутствия доступа покупателям в арендуемое помещение	535,31	Финансовая, страховая деятельность; операции с недвижимым имуществом; предоставление услуг парикмахерскими и салонами красоты; розничная торговля очками; розничная торговля компьютерами, периферийным компьютерным оборудованием; розничная торговля коммуникационным оборудованием (телефонные аппараты); розничная торговля радио- и телевизионным оборудованием; розничная торговля цветами, комнатными растениями; иные цели, возможные на данном объекте (по согласованию с арендодателем с учетом санитарных и противопожарных норм)	Часть помещения на 1-м этаже здания. Имеются: центральное отопление, горячее и холодное водоснабжение, канализация и электроснабжение. Помещение оборудовано пожарной сигнализацией. Ремонт помещения за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат. Период проведения, дизайн-проект, состав ремонтных работ в арендуемом помещении согласовываются с арендодателем. **Срок аренды – 5 лет**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **10 октября 2023 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 08 сентября 2023 г. по 06 октября 2023 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в аукционе

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, где указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3 985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901. **Назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 6-АЧ по предмету аукциона № ___.** Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче заявления на участие в аукционе:

физическое лицо (в том числе индивидуальный предприниматель), желающее участвовать в аукционе, предъявляет документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должна быть засвидетельствована нотариально).

Порядок определения победителя аукциона

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

Дополнительная информация

Возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона).

Телефоны для справок: отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома 11 октября 2023 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Вид вещного права, целевое назначение земельного участка	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; начальная цена земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, Ошмянский район, д. Лейлубка, ул. Центральная, 2, 424981714601000067	0,1847	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен только хозяйственный блок (фундамент бутобетон, стены и перегородки ГСБ, кирпич). Готовность: хозяйственный блок, состоящий из летней кухни 66 %, погреба 90 %, входа в погреб 95,52 %, хозяйственной постройки 95,64 %, бани 57,80 %, гаража 85,72 % Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, связь	513,41, в том числе: 181,80 – определение оценочной стоимости; 96,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 235,61 – публикации в СМИ	19 830,24 (16 801,16; 3 029,08)	1 985,00
2	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Коммунистическая, 30, 424950100001000605	0,0948	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен дом без кровли (фундамент бутобетон, стены ГСБ), хозяйственная постройка (фундамент бутобетон, стены кирпич), элементы благоустройства. Общая площадь здания 189,1 кв. м, хозпостройки 117,0 кв. м. Готовность: жилой дом 34,10 %, подвал 80 %, хозпостройка 33 %, ограждение 100 %, калитка 100 %, ворота 100 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, связь	647,02, в том числе: 133,61 – техническая инвентаризация; 181,80 – определение оценочной стоимости; 96,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 235,61 – публикации в СМИ	49 846,05 (41 541,57; 8 304,48)	4 985,00
3	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Зыгмунта Минейко, 47, 424950100001002984	0,1349	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон, перегородки ФБС). Площадь застройки 129,0 кв. м. Готовность: жилой дом 10,0 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь	662,02, в том числе: 133,61 – техническая инвентаризация; 181,80 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 235,61 - публикации в СМИ	11 038,23 (3 160,07; 7 878,16)	1 110,00
4	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Золотарева, 19, 424950100001002847	0,102	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен фундамент жилого дома (ФБС). Готовность: жилой дом 9,0 % (в т.ч. фундамент 90 %). Протяженность существующего фундамента 49,88 м. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь	489,91, в том числе: 181,80 – определение оценочной стоимости; 72,50 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок 235,61 – публикации в СМИ	9 294,91 (2 848,51; 6 446,40)	930,00
5	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Черкасова, 37, 424950100001002235	0,1094	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон), хозпостройка. Готовность: жилой дом 11 % (в т. ч. фундамент 100 %), площадь постройки 146 кв. м; хозпостройки – 93 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь.	636,94, в том числе: 108,53 – техническая инвентаризация; 181,80 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 235,61 – публикации в СМИ	21 925,57 (15 011,49; 6 914,08)	2 195,00
6	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Молодежная, 84, 424950100001002769	0,1206	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение; На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон). Готовность: жилой дом 10 % (в т.ч. фундамент 100 %). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь.	636,94, в том числе: 108,53 – техническая инвентаризация; 181,80 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 235,61 – публикации в СМИ	11 356,17 (4 313,13; 7 043,04)	1140,00

Организатор аукциона – Ошмянский районный исполнительный комитет, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 103 (время работы – с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел.: (8-01593) 22143, 22151.

Аукцион состоится 11 октября 2023 года в 11.00 по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 71.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 70 в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Начало приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – 11 сентября 2023 года в 8.00, окончание приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – 9 октября 2023 года в 15.00.

Для участия в аукционе по лотам №№ 1–6 приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь и юридическое лицо Республики Беларусь (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с Ошмянским районным исполнительным комитетом соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Кроме того представляются:

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина Республики Беларусь – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет № BY43AKBB36415230009794200000, УНН 500088419, в ЦБУ № 418 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Ошмяны, БИК AKBBBY2X, получатель – Ошмянский райисполком, назначение платежа – внесение задатка для участия в аукционе, задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению

Размер увеличения цены земельных участков (шаг аукциона) – 5 % от предыдущей цены, называемой аукционистом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за предмет аукциона; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также затраты на осуществление государственной регистрации прекращения права собственности земельного участка; осуществить в течение двух месяцев после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся государственную регистрацию прав на предмет аукциона в Ошмянском филиале республиканского унитарного предприятия «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

осуществить завершение строительства одноквартирного жилого дома на предоставленном земельном участке в соответствии с действующим законодательством, разработанной и согласованной в установленном порядке проектной документацией в течение трех лет с даты государственной регистрации земельного участка.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими в рабочее время с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по требованию).

Контактные телефоны: (801593) 22151, 22143, 22145, 22139.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Ошмянского районного исполнительного комитета https://www.oshmiany.gov.by.

Могилевский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении у РУП «Белпочта»

Аукцион состоится **10.10.2023 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352
(офис Могилевского филиала
РУП «Институт недвижимости и оценки»)

Лот № 1: котел отопительный КСТБ-95, инв. № 421370, г. в. – 2012.
Начальная цена продажи: 4 500,00 бел. руб. с учетом НДС.

Лот № 2: котел отопительный КСТБ-95, инв. № 421371, г. в. – 2012.
Начальная цена продажи: 3 900,00 бел. руб. с учетом НДС.

Лот № 3: котел отопительный КСТБ-95, инв. № 421372, г. в. – 2012.
Начальная цена продажи: 2 900,00 бел. руб. с учетом НДС.

Лот № 4: дымовая труба стальная, инв. № 200089.
Начальная цена продажи: 2 832,00 бел. руб. с учетом НДС

Местонахождение лотов №№ 1–4:
Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Интернациональная, 5.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь и на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить
по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте **ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2023.Ч.002.00080** по продаже движимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

Продавец: унитарное производственное предприятие «Глубокский мясокомбинат», 211800, Витебская область, г. Глубокое, ул. Московская, 81, тел. 8 (02156) 37408.

Собственник: открытое акционерное общество «Глубокский молочноконсервный комбинат».

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 09.10.2023 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Движимое имущество.

Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения: котел вакуумный КВ – 4,6М, заводской номер 1343, 1992 года выпуска, инвентарный номер 11071; котел вакуумный КВ – 4,6М, заводской номер 1344, 1992 года выпуска, инвентарный номер 11069; котел вакуумный КВ – 4,6М, заводской номер 1338, 1992 года выпуска, инвентарный номер 11070; котел вакуумный КВМ – 4,6М, заводской номер 1962, 1989 года выпуска, инвентарный номер 11077; котел вакуумный КВМ – 4,6М, заводской номер 1967, 1989 года выпуска, инвентарный номер 11073; котел вакуумный КВМ – 4,6М, заводской номер 1973, 1989 года выпуска, инвентарный номер 11076; котел вакуумный КВМ – 4,6М, заводской номер 1964, 1989 года выпуска, инвентарный номер 11074.

Имущество находится по адресу: Витебская обл., г. Глубокое, ул. Московская, д. 81.

Начальная цена: 187 200,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

Задаток: 18 720,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 06.10.2023.

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия электронных торгов: Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП, и возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки; заключить договор купли-продажи предмета эл.торгов в течение 10 дней с даты утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядки и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Демонтаж и вывоз осуществляется за счет Победителя (претендента на покупку) в течение 30 дней с момента оплаты. Расходы Продавца на проведение независимой оценки – 450,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: станки и оборудование. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Гаврилов Сергей Владимирович конт. тел. +375 (29) 216-32-73.

Стракаты свет

ВЯРТАННЕ Ў ШКОЛУ СЯРЭБРАНЫХ МЕДАЛЁЎ

Міністр асветы Расіі Сяргей Краўцоў заявіў, што з 2023/2024 навучальнага года вернуць сярэбраныя медалі. Пра гэта паведаміў тэлеграм-канал «Вялікая перамена РФ».

«Думаю, і для бацькоў, і для школьнікаў будзе прыемная навіна: мы з гэтага навучальнага года вернем сярэбраныя медалі», — сказаў ён.

Сярэбраны медаль — другая пасля залатога медаля ступень адрознення пры навучанні ў сярэдняй школе. На федэральным узроўні ў Расіі з 2014 года сярэбраны медаль не ўручаецца, аднак рэгіёнам дадзена права самастойна ўстанаўліваць віды заахвочванняў навучэнцаў, у тым ліку і сярэбраныя медалі рэгіянальнага ўзроўню, і ўзнагароджваць імі выпускнікоў.

МАЛАДЫМ БЯСПЛАТНА Ў МУЗЕІ І НА ВЫСТАВЫ

Моладзь Узбекістана з 1 верасня можа бясплатна наведваць гістарычныя помнікі, святыні, дзяржаўныя музеі і выставы.

Бясплатнае наведванне аб'ектаў культурнай спадчыны прадугледжана да дасягнення маладымі людзьмі 18 гадоў. Адпаведны ўказ «Аб першачарговых мерах па рэалізацыі Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан у новай рэдакцыі» падпісаў прэзідэнт Шаўкат Мірзіёеў.

Такім чынам рэалізуюць артыкул 78 новай Канстытуцыі, у якім вызначана, што «дзяржава і грамадства клапоцяцца аб фарміраванні ў дзяцей і моладзі прыхільнасці нацыянальным і агульначалавечым каштоўнасцям, гонару за краіну і багатую культурную спадчыну народа, пачуцці патрыятызму і любові да Радзімы».

З АПОШНЯГА КУРСА КАЛЕДЖА — У ДЗІЦЯЧЫ САДОК

У Расіі група дэпутатаў і сенатараў прапанавала дазволіць навучэнцам педагагічных каледжаў, якія паспяхова прайшлі атэстацыю, на апошнім курсе ўладкоўвацца выхавацелямі ў дзіцячы сад. Па меркаванні аўтараў ініцыятывы, тады пасля вучобы ў выпускнікоў ужо будуць працоўная кніжка і афіцыйны стаж. Аўтары адзначаюць, што цяпер уладкавацца ў дашкольныя арганізацыі могуць толькі студэнты выпускных курсаў вышэйшых навучальных устаноў.

Пры гэтым работа ў час вучобы, звязаная з будучай спецыяльнасцю, з аднаго боку, павышае ўзровень падрыхтоўкі выпускніка і яго канкурэнтаздольнасць, а з другога боку, работадаўцам такая форма падрыхтоўкі спецыяліста дае магчымасць падбіраць кадры, адначасова ўдзельнічаючы ў іх навучанні.

Змяненні прапануецца ўнесці ў федэральны закон «Аб адукацыі» і даць такое права студэнтам, якія вучацца ў каледжах па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя». Для гэтага яны павінны быць паўналетнімі, асвоіць школьную праграму і паспяхова прайсці прамежкавую атэстацыю за два гады навучання, якія папярэднічаюць працаўладкаванню.

Законапраект таксама дазволіць больш актыўна выкарыстоўваць інструмент настаўніцтва: калі ў маладога спецыяліста будуць пытанні, звязаныя з працай, ён зможа кансультавацца ў свайго выкладчыка. Гэтае пытанне абмяркоўвалася са студэнтамі і выкладчыкамі каледжаў і аўтары прапановы прыйшлі да высновы, што новыя нормы створаць умовы для максімальна камфортнага ўваходжання ў прафесію.

ПЛАЦІЦЬ ІНТРАВЕРТАМ ЗА... ВЫХАД З ДОМУ

Міністэрства па пытаннях гендарнай роўнасці і сем'яў Паўднёвай Карэі распрацавала праграму выплат дзецям і маладым людзям ва ўзросце ад 9 да 24 гадоў, якія вядуць пустэльніцкі лад жыцця, перадае Tengritravel.kz са спасылкай на WIONews.

Урад Паўднёвай Карэі спрабуе дапамагчы гэтым людзям выйсці з дому, каб пайсці ў школу, універсітэт або на працу. Удзельнікі праграмы будуць штомесяц атрымліваць выплаты, а непаўналетнія — яшчэ і дадатковыя дапамогі на наведванне культурных мерапрыемстваў.

Асноўнай мэтай гэтай палітыкі з'яўляецца дапамога дзецям, але гэта таксама сродак, з дапамогай якога краіна можа вырашыць праблему скарачэння працаздольнага насельніцтва ва ўмовах нізкай нараджальнасці і строгіх іміграцыйных правілаў.

Па дадзеных Карэйскага інстытута аховы здароўя і сацыяльных спраў, каля 350 тысяч чалавек ва ўзросце ад 19 да 39 гадоў у Паўднёвай Карэі лічацца адзінокімі або ізаляванымі — каля трох працэнтаў ад гэтай узроставай групы. Нягледзячы на бурны рост эканомікі ў апошнія гады краіна працягвае змагацца з высокім узроўнем беспрацоўя сярод моладзі, які з'яўляецца самым высокім сярод усіх узроставых груп і складае 7,2 працэнта.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«Я заўсёды марыў пра вялікую сцэну»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У дадзены момант спявак рыхтуе некалькі новых песень беларускіх і расійскіх аўтараў. Яму прыемна, што ў рэпертуары ёсць песні зорных паэтаў і музыкантаў — Яўгена Алейніка і Юліі Быкавай, Паўла Архіпцава, Кастуся Легастаева, Германа Цітова, Вагана Петрасяна, Іры Эйфарыі, Юліі Бяспалавай, Кірыла Кузьмянко, Юрыя Іофэ. Іх песні спявае не толькі наш герой, але і Рыгор Лепс, Ларыса Доліна, Стас Міхайлаў, Дзіма Білан, Вольга Бузава і шмат якія іншыя артысты, дзеліцца вакаліст.

Малады чалавек удзельнічае ў канцэртах, якія арганізоўвае дабрачынны фонд «Спирос» імя Аляксандра Ціхановіча.

— Некалькі гадоў таму я ўпершыню наведаў падобную імпрэзу, — расказвае Дзмітрый, — гэта была дабрачынная акцыя «Любоў у падарунак» да дня памяці Аляксандра Ціхановіча. Народны артыст супольна з фондам «Спирос» увесь час дапамагаў дзецям і сталым інвалідам, якія жывуць у псіханеўралагічных інтэрнатах.

Спачатку Дзмітрыю было цяжка маральна, ён не ведаў, як правільна сябе паводзіць з такімі людзьмі. Успамінае, што было страшна, а потым убачыў, колькі шчасця і любові ў вачах і душах гэтых людзей.

Спявак любіць эксперыментаваць з музыкай. У яго рэпертуары — розныя песні: лірычныя павольныя, ёсць вельмі сумныя, ёсць хуткія сучасныя, на рускай і беларускай мовах.

— Апошнім часам запісваў і выпускаў толькі рытмічныя песні, у рабоце таксама цяпер усё самае хуткае і вясёлае — вось такі настрой на дадзены момант, і я гэтаму рады. Калі мне дасылаюць песні на разгляд — найперш слухаю мелодыю, далей прыслухоўваюся да тэксту і ўжо потым спрабую гэта дома праспяваць. І бывае так, што песня прыгожая, а вось на голас не кладзецца, цяжка яе спяваць — і гэта не праблема аўтараў, а проста не кладзецца на голас і ўсё, — расказвае спявак.

Песні Дзмітрыя Караля можна пачуць на радыё не толькі ў роднай Беларусі, але і ў Расіі і Казахстане. На некалькі кампазіцый артыст са сваёй творчай камандай здымалі кліпы — іх можна ўбачыць таксама на тэлеканалах нашай краіны. Пазнаёміцца з творчасцю вакаліста можна праз інтэрнэт — песні даступныя для праслухоўвання і спампавання на ўсіх лічбавых пляцоўках і на афіцыйных старонках спевака ў сацыяльных сетках.

Музыка плануе зняць кліп на новую песню «Гэта і ёсць каханне», якая нядаўна выйшла.

— Вельмі шмат станоўчых водгукаў на гэтую песню не толькі ад прафесіяналаў, але і ад звычайных слухачоў — трэба захаваць і памножыць гэтыя эмоцыі, — гаворыць Дзмітрый.

Як ні дзіўна, але наш герой навучыўся знаходзіць час на ўсё. Ён прыстасаваўся сумяшчаць і творчасць, і бізнес.

— Я планую загадзя ўсе свае справы. Паспяваю на працягу дня і на канцэрт з'ездзіць, і рабочыя пытанні вырашыць. Тым больш што цяпер можна рабіць усё ў інтэрнэце дыстанцыйна. У доўгіх падарожжах слухаю і вучу песні. Адзін-два разы на тыдзень увечары хаджу на ўрокі вакалу, каб не толькі трымаць свой галасавы апарат у тонусе, але і развівацца.

Дзмітрый клапоціцца не толькі пра голас, але і пра фізічны стан. У гэтым дапамагаюць здаровы лад жыцця і пазітыў.

— Вось тут якраз мне ёсць чым ганарыцца! *(Смяецца.)* Ужо тры гады я не ўжываю ніякага спіртнога, не куру цыгарэт, імкнуся есці карысную ежу, праўда, з-за нястачы часу даводзіцца часам сілкавацца сасіскамі ды пельменямі. Я ўмею гатаваць, але раблю гэта два разы на год — на Вялікдзень і Каляды! *(Усміхаецца.)*

Артыст любіць шпацыры па горадзе. Мінск ён абагнуў пешкі ўжо не адзін раз — ад пачатковай станцыі метро да канцавой! На работу і з яе — толькі хадой: гэта дапамагае яму захоўваць вагу ў норме.

— Адпачываць мне дапамагаюць пакуль толькі змена дзейнасці і падарожжы ў розныя гарады. Дый, шчыра кажучы, адна і другая работа мне ў задавальненне. Я не магу сказаць, што цяжка — хутчэй, прыемная стомленасць, — расказвае спявак.

Аказваецца, нашаму герою з дзяцінства многае было цікава. Ён шмат чым займаўся: выразаў па дрэве, маляваў, любіў шыць. Пазалетась малады чалавек вырашыў усё ж успомніць шыццё і нешта сабе зрабіць для сцэны.

— Я пайшоў і набыў швейную машынку. Аднак хапіла мяне на пару масак, якія я падарыў сябрам і сваякам, — і ўсё, машынка стаіць у шафе дагэтуль! — дзеліцца Дзмітрый.

Наш герой не супраць паспрабаваць сябе ў ролі акцёра. Пакуль сваё акцёрскае майстэрства ён паказвае і развівае ў кліпах.

— Былі тэлепраекты, у якіх я браў удзел як вядучы і аўтар праекта — менавіта там спатрэбіліся мае акцёрскія таленты *(смяецца)*. Часам мяне запрашаюць у забаўляльныя праграмы, якія можна ўбачыць на нашым ТБ.

За ўсе свае таленты і добрыя чалавечыя якасці Дзмітрый дзякуе бацькам. Яны і дагэтуль падтрымліваюць сына ва ўсіх яго захапленнях. Артыст ганарыцца сваімі поспехамі, а таксама поспехамі блізкіх і сяброў.

— Ганаруся сяброўствам са шмат якімі добрымі людзьмі. Ганаруся кожнай новай песняй, кожным канцэртам і выступленнем. Безумоўна, ганаруся сваёй радзімай і краінай, мірам і спакоем, што пануюць тут.

— Вы вельмі актыўны чалавек, а ці застаецца час для сям'і? — пытаюся ў Дзмітрыя.

— На дадзены момант я адзін. Сваякі і сябры ад гэтага не спяць начамі, я іх імкнуся суцяшаць, што «на ўсё свой час», але іх гэта не спыняе ад пастаяннага нагадвання мне пра важнасць сямі і дзяцей *(усміхаецца)*. Адзінокім я сябе не адчуваю — усё ў мяне выдатна!

— Дзмітрый, якія пажаданні вы пакінеце нашым чытачам?

— Найперш — здароўя! А далей — у адвольным парадку (каму што бліжэй): міру, дастатку ў сямі, упэўненасці ў будучыні, добрых і адданых сяброў, дый проста — добрых людзей побач. Хай усё будзе ЦУ-ДОЎ-НА!

Надзея ЗУЕВА.
Фота з архіва спевака.

Цалкам матэрыял чытайце на zviazda.by.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.384.
Нумар падпісаны ў 19.30 6.09.2023 г.

У ЧАКАННІ СВАЙГО МЁДУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

То суседскі конь прыйдзе на канюшыну, то куры завітаюць, каб пакорпацца ў кветніку, я ўжо не кажу пра шматлікіх катоў і сабак. А летась у нас пад будаўнічым вагончыкам кватхуха ўмудрылася зусім незаўважна вывесці сем ладных жоўценькіх камячкоў. Дык суседзі, якія збегліся паглядзець на нашу знаходку, ці то ўсур'ёз, ці то смехам прапаноўвалі забраць куранят сабе. Маўляў, падгадуеце і будзеце заўсёды са сваімі яйкамі. Куры ж не карова, ім можна насыпаць зерня ды наліць вадзічкі і спакойна пакінуць на пару дзён. Галоўнае — загончык зрабіць, і ўсё. Але мы не паддаліся на ўгаворы і аддалі малянят гаспадарам.

Мінулым летам па наводцы суседзяў паехалі да мясцовых фермераў па памідоры ды агуркі і ўбачылі на адной з вясковых агароджаў надпіс «Прадам мёд». «О, а ў нас якраз мядовыя запасы заканчваюцца, давай завітаем», — прапанавала я. Так мы зусім выпадкова ўпершыню ў жыцці пакаштавалі валошкавы мёд. Гаспадар, хоць і быў заняты, але паказаў нам сваю пасеку, нават дазволіў нашаму малому зазірнуць у вулей і паглядзець на пчолак. «Знаёмая можа аддаць мне проста так два дзедавы вуллі ў добрым стане. Як вы думаеце, наколькі раэльна вось так з нуля заняцца пчалярствам?» — вырашыў параіцца з пчаляром мой муж. На што наш новы знаёмы ўсміхнуўся і сказаў, як адрэзаў: «Для пачатку трэба хоць бы якую кніжку прачытаць». Прайшоў год, за шматлікімі справамі, якіх у вёсцы гаць гаці, муж так і не знайшоў часу, каб дачытаць да канца нават адну кніжку па пчалярстве, хоць і ўзяў у бібліятэцы некалькі штук. Але, як той казаў, лёс, каб і хацеў, не абмінеш. У пачатку гэтага лета ён зусім выпадкова звёў майго мужа з іншым пчаляром. Віктар не стаў адгаворваць, наадварот, падтрымаў, прычым не толькі словам, але і падарыў рой, які злавіў сам, а потым і яшчэ адзін вулей. Маўляў, «нічога не бойся, усяму навучышся ў працэсе. Прынамсі, я так рабіў».

Пасля размовы з Віктарам у мужа выраслі крылы. Ён так натхніўся, што ў той жа дзень паехаў у іншы раён да знаёмых па абяцаныя вуллі. Праўда, ён крыху спазніўся, з двух дамкоў застаўся толькі адзін. Другі, пакуль Уладзь думаў, ужо аддалі суседу па лецішчы.

Разам з драўляным жоўценькім вуллём муж прывёз дадому шмат вошчаных рамак, дымар і ладны стос часопісаў і кніг па пчалярстве. Менавіта па іх асвойваў пчалінае майстэрства былы гаспадар вулля. Што цікава, у яго была алергія на мёд, але ён усё адно займаўся пчоламі, бо вельмі любіў гэтую справу. Дарэчы, тыя вуллі дзядуля змайстраваў сам. Так супала, што ён, як і мой муж, шмат што па дому рабіў уласнымі рукамі, нават мэблю. А яшчэ, як і мы, імкнуўся ўжываць натуральную ежу, таму клапаціўся, каб і гародніна, і мёд былі свае. 15 гадоў таму пчаляр-самавук сышоў у іншы свет, і ўвесь гэты час яго прылады ляжалі без ужытку на лецішчы. Яго дзецям і ўнукам ужо даўно хацелася вызваліць месца, але, прызналіся, выкінуць рука не падымалася. Хацелася аддаць гэты скарб не абы-каму, а чалавеку, які б дакладна пранікся пчоламі, каб дзедава справа жыла.

Неўзабаве пасля таго, як муж устанавіў за хатай свой першы пчаліны дамок, яны з Віктарам у прыцемках засялілі туды адлоўлены рой. Першым чынам Уладзю параілі абзавесціся касцюмам пчаляра. Менавіта яго я і падарыла мужу на дзясятую гадавіну нашага знаёмства. Выбіраць абноўку паехалі разам у спецыялізаваную краму, у якой, дарэчы, вельмі прыемна пахне мёдам. І выйшлі адтуль не толькі з ільняным «скафандрам», але і з жоўтай скрыначкай, у якой поўзала пазначаная чырвонай меткай пчаліная каралева пароды карніка з часткай сваёй світы. Гэта сэнсэй (з японскай мовы — настаўнік) мужа, у якога мы надоечы купілі рой, прыязджаў да нас і, зазірнуўшы ў адлоўлены вулей, параіў замяніць матку, бо яна старая. Лічу, мужу вельмі пашанцавала сустрэць на сваім шляху Леаніда. Гэта чалавек, які большую частку свайго жыцця прысвяціў пчолам, ахвотна дзеліцца тым, што ведае, з пачаткоўцам. Яму можна ў любы час патэлефанаваць і спытаць парады.

Карацей, як бачыце, усё складваецца само сабой. На нашым шляху сустракаюцца людзі, гатовыя падзяліцца не толькі досведам, але і аддаць пчаліныя дэвайсы. Вось і надоечы муж прывёз з суседняй вёскі медагонку 1955 года вырабу, раёўную, другі дымар, воскатапілку. Валерыю — 69, пасля смерці таты-пчаляра ён займаўся пчоламі два гады. У яго было 11 вулляў. Але так сталася, што восы адным махам знішчылі ўсе яго пчаліныя сем'і... І мужчына закінуў тую справу. У выніку ўсе бацькавы пчалярскія прылады больш як 20 гадоў пылілася ў яго на лецішчы. Менавіта таму ён абрадаваўся магчымасці падарыць ім новае жыццё. І проста так аддаў нам свае скарбы, у тым ліку шматкорпусныя вуллі, якія захоўваліся ў яго пчальніку пад дахам. У мужа пакуль няма вялікіх амбіцый, кажа, што не плануе займацца пчалярствам дзеля грошай. Проста хочацца, як і ўладальніку нашага першага вулля, забяспечваць натуральным мёдам сваю сям'ю, сяброў і аднаяскоўцаў. Таму марыць з часам пашырыць пасеку да пяці-сямі вулляў.

Таму, каб завесці пчол, паспрыяла яшчэ і тое, што мы некалькі месяцаў назад вырашылі паспрабаваць адмовіцца ад цукру. Нават у выпечку ў якасці альтэрнатывы пачалі дадаваць мёд. Шмат «жоўтага золата» ў нас ідзе на кансервацыю абляпіхі, каліны і чарнаплоднай рабіны. А яшчэ нядаўна адкрылі для сябе пярсту, якая смачнейшая за любую цукерку. Мы купілі яе ў пчаляра Генадзя на кірмашы ва Уздзе. Дарэчы, калі не ведалі, пачытайце, колькі разнастайных вітамінаў, лячэбных кампанентаў і мікраэлементаў яна ўтрымлівае. Акрамя таго, набылі ў пчаляра і слоічак пчалінага падмору — думаем зрабіць з яго гаючую мазь. Аказваецца, загінулых пчол (летам яны жывуць не больш за 35-40 дзён) можна не выкідваць, а выкарыстоўваць як для лячэння розных захворванняў, так і проста для павышэння імунітэту.

Забіраючы медагонку, муж паабяцаў Валерыю, што абавязкова пачастуе яго сваім першым мёдам. Цяпер жа той купляе мёд у жанчыны з Узды. Муж адразу ж паглядзеў на мяне, маўляў, «бачыш, нават жанчыны займаюцца пчоламі, глядзіш, з часам купім і табе ахоўны касцюм і будзеш мне дапамагаць. Грэх не заняцца пчоламі, калі ў тваёй маці нават дзявочае прозвішча Бортнік». Дарэчы, мама распавядала, што ў маленстве яны з братам елі мёду ўволю, бо яе дзядуля трымаў пасеку. У маім дзяцінстве таксама ў сезон на стале вадзіўся мёд у сотах, бо ў суседстве жыў ветурач, вуллі якога месціліся якраз за нашым агародам. Памятаю, любіла мачаць агуркі ў вадкі мёд, гэтым летам адкрыла такі ласунак для сына. А яшчэ цяпер мы ўсёй сям'ёй глядзім дакументальныя фільмы пра пчол, вучымся адрозніваць матку і трутняў, карыстацца дымаром... І марым пакаштаваць у бягучым сезоне свайго мядку. Прынамсі, Леанід, калі аглядаў рамкі, сказаў, што пчолкі яго ўжо даволі шмат наносілі. Цяпер муж пад кіраўніцтвам сэнсэя падкормліваe працаўніц адмысловым сіропам, абараняе іх ад вос і кляшчоў — ставіць адмысловыя пасткі, уцяпляе вуллі старой ватнай коўдрай на зіму. Я ж, калі бачу, як свецяцца яго вочы ад шчасця, калі ён вяртаецца ад сваіх новых дзвюх сем'яў, разумею, што людзі, якія хацелі аддаць вуллі ў надзейныя рукі, не прагадалі. Гісторыя іх продкаў, падказвае мне інтуіцыя, будзе мець працяг. Бо добрая справа заўсёды працягваецца...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.

Увесь гэты рыштунак нам дастаўся абсалютна бясплатна.

Мацуем пчалінную пастку на вясковую ліпу. На ёй, казаў сусед, пару гадоў таму ўжо вісеў рой.

Мастацкая падзея

АПАВЯДАННІ СУЧАСНЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ: ПРАЦЯГ ТВОРЧАГА ПРАЕКТА

У выдавецтве «Аверсэв» убачыла свет чарговая, другая па ліку, кніга ў серыі «Сучасная беларуская літаратура», — зборнік апавяданняў «Душа твая светлая». Першым томам серыі быў зборнік аповесцяў — «Дараванне», у якім да чытача прыйшлі творы Алега Ждана, Алеся Бадака, Алены Брава, Андрэя Федарэнкі.

У кнігу ўвайшлі апавяданні Алега Ждана («Мужская любовь»), Расціслава Бензярука («Клоўн Кузёмка»), Зіновія Прыгодзіча («Дзікая архідэя», «Ружовы туман»), Алены Паповай («Куриный бог», «У входа»), Анатоля Бутэвіча («Татка, прыязджай...», «Закаханы Сарокаён»), Сяргея Трахімёнка («Суета сует», «Третья пара туфель»), Валерыя Казакова («Дикий шорец», «Православный немец»), Віктара Праўдзіна («Трыццаць міль да святасці»), Людмілы Рублеўскай («Железная кнопка», «Семела і Юпітэр», «Чатыры калоны»), Алеся Бадака («Дождж ліў як з вядра», «Душа твая светлая»), Сяргея Белаяра («Лёд»). Разам прадстаўлены творчыя здзяйсненні добра вядомых празаікаў розных пакаленняў, якія пішуць на беларускай і рускай мовах. Усе апавяданні раней былі надрукаваныя ў розных літаратурна-мастацкіх перыядычных выданнях, а часам — і ў асобных кнігах аўтараў зборніка «Душа твая светлая». Безумоўна, гэта толькі частка найлепшых здабыткаў беларускіх літаратараў у жанры апавядання. Відавочна, што серыя «Сучасная беларуская літаратура» патрабуе папаўнення.

З прадмовы да кнігі «Душа твая светлая»: «...Чаго мы чакаем ад сучаснага апавядання? Паўтарэння традыцый, якія закладзены пакаленнямі беларускіх літаратараў папярэдніх дзесяцігоддзяў? Але ж час няўмольна хуткаплынны. Ён парушае пэўныя, здавалася б, некалі трывалыя, межы; падобныя да неўтаймоўнай рачной вады ў пару вясенняга разліву, што разбурае ўсе перашкоды, нават рушыць дамбы. Забароны на творчы прагрэс і інструкцый наконт таго, як ён павінен выглядаць, безумоўна, няма. Асабліва ў век, калі дзякуючы сучасным тэхналогіям друку і з прычыны істотнага зніжэння ўзроўню культуры ў грамадстве, масавая літаратура перамагае на ўсіх франтах... З другога боку, ніхто не прымушае нас чытаць абавязкова новае, створанае сёння. І праз школьныя ўрокі, і па ўласным жаданні, сустрэўшыся з добрым словам, сапраўдным мастацтвам, мы, як чытачы, па-ранейшаму

апынаемся ў прасторы беларускага апавядання, створанага талентам, розумам Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Яна Скрыгана, Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Вячаслава Адамчыка, Анатоля Кудраўца, Івана Чыгрынава, Барыса Сачанкі, Алеся Жука, Хрысціны Лялько, Уладзіміра Ягоўдзіка... Пералік імён аўтараў можа быць доўгім. Беларускі літаратурны працэс нарадзіў на дзіва шмат цікавых апавядальнікаў».

І гэты працэс нараджэння працяг ужо даўно ідзе і сёння. На старонках не толькі часопісаў «Нёман», «Полымя», «Маладосць», у газеце «Літаратура і мастацтва», а яшчэ ў грамадска-палітычнай газеце «Звязда», жаночым часопісе «Алеся» з'яўляюцца апавяданні самых розных сучасных аўтараў. Часам — добра вядомых не толькі ў літаратурным асяроддзі, але і шырокаму колу чытачоў. А часам — і зусім невядомых, дэбютантаў, пачаткоўцаў. Жыццё жанру апавядання працягваецца...

Раман СЭРВАЧ.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Персональный компьютер, инв. № 157	2,34	0,23	0,12
2	Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 143	131,40	13,14	6,57
3	Автомобиль ГАЗ- 32213-408 сл. кузов, инв. № VIL00208	558,00	55,80	27,90
4	Автомобиль ГАЗ 32213-414, инв. № 62	180,00	18,00	9,00
5	Полуавтомат для сварки инверторный MIG500A/MMA, инв. № 203	270,00	27,00	13,50
6	Холодильник МХМ-2808-90. сер-т BY/112 03/06/002, инв. № 139	39,60	3,96	1,98
7	Сканер CANON 400 2996C010, инв. № 218	54,00	5,40	2,70
8	Монитор ЖКИ, инв. № 70	5,40	0,54	0,27
9	Сварочный полуавтомат ПДГ-354, инв. № 115	126,00	12,60	6,30
10	Монитор LCD Philips, инв. № 100	5,40	0,54	0,27
11	Принтер Phaser 3150, инв. № 79	11,88	1,19	0,59
12	Сварочный генератор WAGT 220DC HSB, инв. № 140	106,20	10,62	5,31
